СПЕЦВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

23 снежня 2016 года, № 17 (2164)

# Запрашае БДУ!

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** – найстарэйшы класічны ўніверсітэт нашай краіны, вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі, найбуйнейшы адукацыйны, навукова-вытворчы і культурны цэнтр Рэспублікі Беларусь, сучасны ўніверсітэт, які дынамічна развіваецца і імкнецца да вяршыняў сусветных рэйтынгаў.

Зараз у БДУ навучаецца больш за **29 тысяч студэнтаў** I і II ступеняў, з іх каля 21 тыс. – на дзённай і звыш за 8 тыс. – на завочнай форме навучання. Іх падрыхтоўкай займаюцца больш за 3,1 тыс. выкладчыкаў, у тым ліку 15 акадэмікаў і 16 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі, больш за 400 прафесараў і болей за 1750 кандыдатаў навук. Навучальны працэс вядзецца па 83 спецыяльнасцях, 81 напрамку, па 278 спецыялізацыях.

Вучыцца ў асяроддзі талентаў, у вялікіх настаўнікаў, вучыцца самастойнаму атрыманню ведаў – вось тое, што сёння стварае неабходны падмурак паспяховасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

**У 2017 годзе** прыём на першы курс будуць ажыццяўляць 16 факультэтаў, а таксама Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій, Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла, Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава. Усяго плануецца прыняць каля 5,5 тыс. абітурыентаў, у тым ліку звыш 2 тыс. на дзённую бюджэтную форму навучання.

За апошнія 3 гады ў БДУ пачалася падрыхтоўка па 19 новых спецыяльнасцях і 37 напрамках спецыяльнасцяў I ступені вышэйшай адукацыі.

Студэнты БДУ бяруць удзел у міжнародных алімпіядах па матэматыцы; па інфарматыцы і праграмаванні; па экстрэмальным праграмаванні IEEEXtreme 5.0; экалагічнай бяспецы; па прыкладных матэматыцы і фізіцы; па эканамічных, фінансавых дысцыплінах і пытаннях кіравання; па дызайне, у рэспубліканскай алімпіядзе па правазнаўстве. **Каманда студэнтаў БДУ неаднаразова станавілася прызёрам чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM ICPC).** Студэнты ўдзельнічаюць у міжнародных конкурсах кітайскай мовы і творчасці (КНР, Шыцзячжуан); па міжнародным гуманітарным праве імя Ф. Мартэнса; па інвестыцыйным праве FDI Moot Court (Вялікабрытанія, Лондан) і інш.

Арганізацыя навучання ў БДУ грунтуецца на абавязковым спалучэнні яго з навукова-даследчай дзейнасцю. Тут дзейнічае болей за 40 СНДЛ прыродазнаўчанавуковага і гуманітарнага кірунку.

БДУ мае пагадненні аб супрацоўніцтве болей чым з 360 універсітэтамі з 50 краін свету, што дазваляе развіваць акадэмічную мабільнасць, удзельнічаць у праграмах абмену, такіх як Erasmus+. 30 замежных грамадзян з'яўляюцца ганаровымі прафесарамі БДУ.



*Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта акадэмік Сяргей Уладзіміравіч АБЛАМЕЙКА*

**У сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы, паводле вядучых рэйтынгаў, БДУ ўваходзіць у 2 % найлепшых універсітэтаў.** У верасні 2016 г. наш універсітэт прасунуўся на 354 месца ў рэйтынгу брытанскага агенцтва QS (QS World University Rankings). Таксама БДУ стаў адзінай беларускай вышэйшай навучальнай установай, якая ўвайшла ў прэстыжны рэйтынг THE World University Rankings 2015–2016.

У БДУ створаны спрыяльныя ўмовы для працы і адпачынку. Студэнцкі гарадок, у структуру якога ўваходзяць 10 інтэрнатаў, – гэта агульны дом для 8 тысяч навучэнцаў, гэта органы студэнцкага самакіравання і цудоўная магчымасць для самарэалізацыі студэнтаў. Да паслуг студэнтаў – стадыёны, спартыўныя і трэнажорныя залы, басейны. Дзейнічае больш за 60 агульнаўніверсітэцкіх творчых калектываў і аб'яднанняў.

Дарагія абітурыенты! Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт зацікаўлены, каб у яго аўдыторыі прыйшлі самыя падрыхтаваныя і таленавітыя маладыя людзі. Незалежна ад абранай спецыяльнасці навучання ў вас ёсць магчымасць атрымаць тут адукацыю сусветнага ўзроўню.

Сённяшняе жыццё патрабуе бесперапыннай адукацыі на працягу ўсяго жыцця. У Беларускім дзяржаўным універсітэце вы атрымаеце не вузкую спецыяльнасць, а той падмурак, на якім зможаце будаваць сваё прафесійнае і асабаснае развіццё.

Наш універсітэт – гэта вялікая дружная сям'я з шматгадовымі традыцыямі, моцнай адукацыйнай і навуковай базай. Мы ганарымся сваімі выпускнікамі, якія займаюць адказныя пасады і пасады рознага ўзроўню, з'яўляюцца кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў як у нашай краіне, так і за мяжой, уносяць вялікі ўклад у развіццё навукі і адукацыі. Верым, што зусім хутка мы будзем ганарыцца і вамі.

***Жадаем поспеху!***

## АДРАС ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ

***Мінск, вул. Ленінградская, 16, корпус геаграфічнага факультэта, п. 112.***
***Даведкі па тэл. 209-50-85 (шматканальны).***
*Уся інфармацыя, што датычыцца паступлення ў БДУ, размешчана на сайце:*
***www.abiturient.bsu.by***

# ГРАФІК ПРАВЯДЗЕННЯ ДЗЁН АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ
## у БДУ на 2016/2017 навучальны год

| Факультэт | Дата, час | Адказны | Тэлефон |
|---|---|---|---|
| БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Курчатава, 10, аўд. 1 | 28 снежня 2016 г., 13-30<br>30 сакавіка 2017 г., 13-30 | Дзітчанка Таццяна Іванаўна | 209-59-40 |
| ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Кастрычніцкая, 2, канферэнц-зала | 03 снежня 2016 г., 10-00<br>11 лютага 2017 г., 10-00 | Гаргуль Алег Валер'евіч | 209-52-82 |
| ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Ленінградская, 16, аўд. 312 | 05 студзеня 2017 г., 14-00<br>30 сакавіка 2017 г., 14-00 | Грышчанкава Наталля Дзмітрыеўна | 209-54-91 |
| ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ<br>вул. Кальварыйская, 9, актавая зала | 05 студзеня 2017 г., 12-00<br>30 сакавіка 2017 г., 12-00 | Курэйчык Ганна Віктараўна | 259-70-17 |
| ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Чырвонаармейская, 6, актавая зала | 05 студзеня 2017 г., 12-00<br>25 сакавіка 2017 г., 13-00 | Бярэйшык Лілія Уладзіміраўна | 209-55-98 |
| МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>пр. Незалежнасці, 4, аўд. 433 | 06 студзеня 2017 г., 12-00<br>31 сакавіка 2017 г., 12-00 | Вялько Аксана Аляксандраўна | 209-52-49 |
| ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН<br>вул. Ленінградская, 20, аўд. 1201 | 14 студзеня 2017 г., 13-00<br>25 сакавіка 2017 г., 13-00 | Карэлін Сяргей Валер'евіч | 209-59-77 |
| ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ<br>пр. Незалежнасці, 4, аўд. 521 | 05 студзеня 2017 г., 14-00<br>28 сакавіка 2017 г., 14-00 | Задворны Барыс Валянцінавіч | 209-50-70 |
| ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ<br>вул. Курчатава, 5, аўд. 115 | 05 студзеня 2017 г., 10-00<br>25 сакавіка 2017 г., 10-00 | Ушакоў Дзмітрый Уладзіміравіч | 209-58-18 |
| ФАКУЛЬТЭТ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ<br>вул. Курчатава, 5, аўд. 212 | 26 снежня 2016 г., 12-00<br>27 сакавіка 2017 г. 12-00 | Паўлюць Таццяна Андрэеўна | 209-59-11 |
| ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК<br>вул. Кальварыйская, 9, аўд. 635 | 04 студзеня 2017 г., 14-00<br>29 сакавіка 2017 г., 14-00 | Бобр Аляксандр Міхайлавіч | 259-74-06 |
| ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>пр. Незалежнасці, 2, аўд. 220 | 04 студзеня 2017 г., 12-00<br>25 сакавіка 2017 г., 12-00 | Саладухін Ігар Анатольевіч | 209-50-67 |
| ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. К. Маркса, 31, актавая зала | 05 студзеня 2017 г., 12-00<br>28 сакавіка 2017 г., 12-00 | Крычко Вольга Пятроўна | 222-36-02 |
| ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Ленінградская, 14, аўд. 301 | 26 снежня 2016 г., 14-00<br>25 сакавіка 2017 г., 14-00 | Цабкала Жанна Анатольеўна | 209-55-16 |
| ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. К. Маркса, 31, аўд. 63 | 05 студзеня 2017 г., 14-00<br>27 сакавіка 2017 г., 14-00 | Каралёва Ганна Анатольеўна | 222-39-96 |
| ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ<br>вул. Ленінградская, 8, аўд. 609 | 04 студзеня 2017 г., 10-00<br>22 сакавіка 2017 г., 10-00 | Сатолін Уладзімір Мікалаевіч | 209-52-79 |
| ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ<br>вул. Шпалерная, 7, аўд. 106 | 27 снежня 2016 г., 11-00<br>31 сакавіка 2017 г., 11-00 | Усцюшэнка Наталля Андрэеўна | 306-00-19 |
| ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ<br>вул. Маскоўская, 5, аўд. 211 | 05 студзеня 2017 г., 12-30<br>01 красавіка 2017 г., 11-00 | Зубараў Андрэй Васільевіч<br>Зайкоўская Таццяна Вікенцьеўна | 399-23-93 |
| ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА<br>пр. Незалежнасці, 24, аўд. 307 | 28 снежня 2016 г., 13-00<br>29 сакавіка 2017 г., 13-00 | Шымбалёва Алена Юр'еўна | 327-63-67 |
| МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА<br>вул. Даўгабродская, 23/1, аўд. 21 | 05 студзеня 2017 г., 12-00<br>01 красавіка 2017 г., 12-00 | Грыцкевіч Яўген Расціслававіч<br>Пуцік Уладзімір Станіслававіч | 398-93-59<br>398-98-61 |
| ФАКУЛЬТЭТ ДАЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ<br>вул. Акадэмічная, 25, аўд. 303 | 28 снежня 2016 г., 14-30<br>29 сакавіка 2017 г., 14-30 | Андрыянава Алена Мікалаеўна<br>Сакольчык Ірына Анатольеўна | 284-00-14<br>284-00-83 |
| ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ<br>вул. Камсамольская, 21, аўд. 409 | 05 студзеня 2017 г., 10-00<br>30 сакавіка 2017 г., 10-00 | Урублеўская Ніна Генадзьеўна | 328-55-34 |
| ЛІЦЭЙ<br>вул. Ульянаўская, 8, актавая зала | 27 снежня 2016 г., 11-00<br>28 сакавіка 2017 г., 11-00 | Шніп Макар Аляксандравіч | 209-52-65 |

# ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Віктар Міхайлавіч АНІШЧЫК*
*Адрас: г. Мінск, працп. Незалежнасці, 2. Тэл. 209-52-67, 209-51-15.*
*E-mail: physdean@bsu.by; www.physics.bsu.by*

Агульная колькасць прафесараў – 28; дацэнтаў – 64; аспірантаў – 44; магістрантаў – 20; студэнтаў – 599.

Падрыхтоўка ажыццяўляецца па спецыяльнасцях **«Камп'ютарная фізіка»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Праграміст»*), **«Ядзерныя фізіка і тэхналогіі»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), **«Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій»** (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*), а таксама **«Фізіка»,** у межах якой тры напрамкі: навукова-даследчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Даследчык»*), вытворчы (кваліфікацыя – *«Фізік. Інжынер»*) і кіраўніцкі (кваліфікацыя – *«Фізік. Менеджар»*).

На другім курсе студэнты размяркоўваюцца па спецыялізацыях, якія адпавядаюць розным галінам сучаснай фізічнай навукі: нана- і мікраэлектроніка, фізіка паўправаднікоў і паўправадніковых матэрыялаў, праграмаванне і інфармацыйнае забеспячэнне вылічальных сістэм, біяфізіка і біятэхналогіі, нанабіяматэрыялы, квантавая і аптычная электроніка, лазерныя сістэмы і тэхналогіі, нанафатоніка, фізічная оптыка, ахоўныя і плазмавыя пакрыцці і плёнкі, фізіка цвёрдага цела і матэрыялазнаўства, функцыянальныя нанаматэрыялы, ядзерная фізіка, фізіка ядзерных рэактараў і атамных энергетычных установак, ядзерная бяспека, электроннае прыборабудаванне і схематэхніка, энергафізіка і нетрадыцыйныя крыніцы энергіі, атамная фізіка і фізічныя метады пераўтварэння інфармацыі, тэарэтычная фізіка і іншыя.

Акрамя фундаментальнай падрыхтоўкі па фізіцы і матэматыцы, асаблівая ўвага на факультэце звяртаецца на сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі і інфарматыку. Штогод частка нашых выпускнікоў размяркоўваецца па заяўках вядучых камп'ютарных кампаній: СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» (больш вядомае як IBA), ЗТАА EPAM Systems, ААТ «АМП-софт», ЗТАА «Эксадэл», ЗАТ «Ітранзішн» і інш.

Нашы выпускнікі працуюць у НДІ, канструктарскіх бюро, на навукова-вытворчых прадпрыемствах, у навучальных установах і іншых арганізацыях, у тым ліку ў фірмах рознага профілю.



У чым спецыфіка фізічнага факультэта, якія магчымасці развіцця навуковай кар'еры? Думкамі на гэту тэму з намі падзяліўся прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі, прэзідэнцкі стыпендыят за 2010 г. ***Андрэй Навіцкі,*** які скончыў фізфак у 2002 г.: *«Тых, хто ідзе на фізічны факультэт, прыцягвае магчымасць спазнаць свет, зразумець законы прыроды, мець зносіны з замежнымі калегамі, быць у рэчышчы сучасных даследаванняў у любой галіне фізікі. Вялікая колькасць выпускнікоў кафедры тэарэтычнай фізікі працуюць ва ўніверсітэтах і інстытутах па ўсім свеце, у навукаёмістай індустрыі. З 2010 па 2012 гады я працаваў у Інстытуце фатонікі Тэхнічнага ўніверсітэта Даніі ў групе «Метаматэрыялы» (кіраўнік – былы супрацоўнік кафедры тэарэтычнай фізікі А.У. Лаўрыненка). Мне спадабалася, што ў Даніі працуюць людзі з многіх краін свету, што там часта праводзяцца семінары, на якіх можна даведацца новае з першых вуснаў. На кафедры тэарэтычнай фізікі мы пастараліся стварыць пэўны аналаг атмасферы такіх семінараў».* Застаецца дадаць, што зараз Андрэй Навіцкі праходзіць чарговую стажыроўку ў Даніі.

Узровень адукацыі, атрыманы на факультэце, дазваляе выпускнікам лёгка адаптавацца да працы не толькі па фізіка-тэхнічным профілі, але і ў іншых галінах (арганізацыйнай, камерцыйнай, банкаўскай, выдавецкай і інш.). Даказвае гэта прыклад ***Віталя Брагінца,*** выпускніка фізічнага факультэта, а зараз дырэктара ўласнай юрыдычнай фірмы, якая паспяхова існуе ўжо болей за 10 гадоў. *«Вельмі добра адчуваецца розніца паміж падыходам да права юрыста і падыходам фізіка-юрыста,* – падзяліўся ўласным досведам Віталь Фёдаравіч. – *Разглядаючы заканадаўства, я аналізую яго так, як гэта робяць фізікі ў дачыненні да фізічных заканамернасцяў і з'яў. Тым больш сённяшняе жыццё немагчыма ўявіць без высокіх тэхналогій. А займацца юрыдычным суправаджэннем навукова-тэхнічных галін, безумоўна, можа толькі той, хто добра з імі знаёмы».* В. Брагінец лічыць, што фізічны факультэт – выдатнае месца для набыцця ведаў і навыкаў, якія могуць быць скарыстаныя ў прынцыпе ў любой прафесіі. Ён спрыяе развіццю аналітычнага мыслення, логікі – таго, што неабходна для паспяховай дзейнасці ў кожнай сферы.

Больш падрабязныя звесткі пра факультэт можна знайсці на нашым сайце, дзе змешчана інфармацыя пра «Дні адчыненых дзвярэй» (4 студзеня і 25 сакавіка 2017 года), вочна-завочную школу па фізіцы і матэматыцы для абітурыентаў, а таксама шмат іншай карыснай інфармацыі.

*Паважаныя абітурыенты! Сардэчна запрашаем вас на фізічны факультэт БДУ, дзе вы зможаце атрымаць якасную сучасную адукацыю і авалодаць самай універсальнай прафесіяй – ФІЗІК.*

# МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Дзмітрый Георгіевіч МЯДЗВЕДЗЕЎ*
*Адрас: г. Мінск, праcп. Незалежнасці, 4.*
*Тэл. 209-50-46, 209-52-49.*
*E-mail: medvedev@bsu.by; www.mmf.bsu.by*

На 11 кафедрах працуюць 152 выкладчыкі, з іх 3 акадэмікі і 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 35 прафесараў, 83 дацэнты, кандыдаты навук.

Факультэт вядзе набор на наступныя спецыяльнасці: **«Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі», «Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз», «Матэматыка (па напрамках)».** З верасня 2013 г. адбыўся пераход на чатырохгадовае навучанне.

У рамках спецыяльнасці **«Механіка і матэматычнае мадэляванне»** вядзецца падрыхтоўка па розных напрамках сучаснай механікі і выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у механіцы. У студэнтаў ёсць магчымасць асвойваць такія сучасныя напрамкі, як «Фундаментальныя і прыкладныя праблемы механікі суцэльных асяроддзяў», «САПР і робататэхніка ў механіцы», «Камп'ютарная механіка», «Біямеханіка» і «Механіка нанасістэм».

Выпускнікі спецыяльнасці «Механіка і матэматычнае мадэляванне» будуць працаваць у ВНУ; навукова-даследчых установах; канструктарскіх і праектных арганізацыях; ва ўстановах і арганізацыях, звязаных з мадэляваннем (матэматычным і камп'ютарным) механічных працэсаў і механізмаў, а таксама з праграмаваннем. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Механік. Матэматык-прыкладнік».*

Падрыхтоўка па спецыяльнасці **«Матэматыка»** адбываецца па асобных навучальных планах адпаведна сённяшнім патрабаванням з вывучэннем найноўшых праграмна-інфармацыйных асяроддзяў, што дае магчымасць размеркавання ў прэстыжныя IT-кампаніі.

Выпускнікам навукова-вытворчага напрамку даецца кваліфікацыя *«Матэматык».* Яны працуюць у навучальных установах, НДІ, канструктарскіх бюро, інфармацыйных цэнтрах, на прадпрыемствах, у банках і г. д.

Студэнты навукова-педагагічнага напрамку дадаткова вывучаюць прадметы псіхолага-педагагічнага цыкла. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі».*

Напрамак «Эканамічная дзейнасць» мае эканамічны ўхіл. Выпускнікі працуюць як прафесійныя матэматыкі ў даследчых установах, а таксама як эканамісты-матэматыкі – у банках, страхавых фірмах, агенцтвах па продажы нерухомай маёмасці і г.д. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Матэматык-эканаміст».*

Выпускнікі напрамку «Навукова-канструктарская дзейнасць» працуюць у айчынных і замежных даследчых установах, праектных арганізацыях, на прадпрыемствах. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Канструктар праграмна-апаратных сістэм».*



Выпускнікі спецыяльнасці **«Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз»** будуць спецыялістамі па распрацоўцы, стварэнні і суправаджэнні інфармацыйных сістэм любога ўзроўню; распрацоўцы і прымяненні матэматычных метадаў апрацоўкі, назапашвання, надзейнасці захавання, перадачы і забеспячэння абароны інфармацыі. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Сістэмны аналітык».*

З 2014 г. на спецыяльнасць **«Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі»** набор праходзіць па двух напрамках: «Вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі» і «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне мабільных прылад».

У рамках гэтых напрамкаў студэнты будуць вывучаць курсы па асноўных мовах праграмавання, Java і .NET-тэхналогіях, тэхналогіях праектавання і работы з базамі дадзеных, камп'ютарнай бяспецы і абароне інфармацыі. Кваліфікацыя спецыяліста – *«Матэматык. Спецыяліст па інфармацыйных тэхналогіях».*

***Аляксандр Машэнскі, выпускнік 1992 г., генеральны дырэктар СП «СантаІмпэксБрэст».***

*– Вызначальным для мяне пры паступленні на механіка-матэматычны факультэт стала тое, што мяне будуць вучыць высокапрафесійныя настаўнікі. У мяне не было сумненняў у тым, што я атрымаю якасную адукацыю.*



*Мне сапраўды пашанцавала, што гады вучобы прайшлі менавіта тут, дзе базавыя дысцыпліны, спорт і зносіны даюць магчымасць фарміраваць сябе не толькі як прафесіянала, а таксама як асобу.*

*Тыя навыкі, якія я атрымаў у час вучобы, дапамаглі мне дасягнуць поспехаў у тым, чым я займаюся зараз.*

*У сваім жыцці я сустракаю вялікую колькасць паспяховых людзей, моцных кіраўнікоў, выдатных лідараў, прычым мяне асабліва радуе тое, што сярод іх значную долю складаюць выпускнікі мехмата БДУ.*

***Максім Міхалёў, выпускнік 2006 года, заснавальнік кампаніі ARTOX.***



*– Мехмат вучыць думаць, аналізаваць, прымаць рашэнні – гэта тыя фундаментальныя навыкі, якія дазваляюць развівацца і разбірацца ў самых розных сферах. Мой выпуск прыйшоўся на час станаўлення IT-індустрыі ў краіне. Яшчэ не было такога попыту на выпускнікоў. Мы адчувалі, што сталі вельмі разумнымі, але кожны сутыкнуўся з пытаннем, дзе ўжыць свае веды. Мяне ўніверсітэт звёў з самымі лепшымі сябрамі, і разам мы адкрылі IT-кампанію, у якой праз тры гады ўжо працавалі больш за 100 чалавек. Выпускнікі мехмата з пазіцыі стажораў за год выраcталі па кар'ернай лесвіцы да кіраўнікоў аддзелаў. База, якую нам даў мехмат, дазволіла вельмі хутка выявіць сябе і дамагчыся поспеху ў абсалютна розных галінах.*

*Я вельмі рады таму, як развіваецца IT-індустрыя. На рынку з'явіліся кампаніі, якія займаюцца камп'ютарным праектаваннем, робататэхнікай. Гэта адкрывае новыя бліскучыя перспектывы для выпускнікоў нашага факультэта.*

# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар юрыдычных навук прафесар*
***Сяргей Аляксандравіч БАЛАШЭНКА***
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 8. Тэл./факс 209-52-30.*
*E-mail: law@bsu.by; www.law.bsu.by*

Юрыдычны факультэт БДУ – гэта прэстыж, творчасць, будучыня, фундаментальныя веды, высокая прафесійная падрыхтоўка!

Выкладчыцкі склад: 27 дактароў навук і прафесараў, 145 кандыдатаў юрыдычных навук, дацэнтаў, 89 выкладчыкаў.

На факультэце 11 кафедраў, «Юрыдычная клініка» і 3 вучэбныя кабінеты: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, прававой інфарматыкі. Навучаецца больш за 3,5 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па трох спецыяльнасцях: **«Правазнаўства»** – кваліфікацыя *«Юрыст»*; **«Паліталогія»** – кваліфікацыя *«Палітолаг-юрыст»* і **«Эканамічнае права»** – кваліфікацыя *«Юрыст з веданнем эканомікі»*. Па спецыяльнасці «Правазнаўства» прапануецца таксама завочная форма навучання, у тым ліку для асоб, якія атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю.



Студэнты-прававеды спецыялізуюцца па 10 напрамках: арганізацыя і дзейнасць дзяржаўных органаў, гаспадарчае права, судова-пракурорска-следчая дзейнасць, адвакатура і натарыят, падатковае і банкаўскае права, параўнальнае правазнаўства, прававое забеспячэнне камерцыйнай дзейнасці, прававое рэгуляванне фінансаў і крэдыту, палітыка і дзяржаўнае кіраванне, еўрапейскае эканамічнае права.

Вучэбны працэс спалучае класічную форму выкладання з новымі адукацыйнымі тэхналогіямі. Факультэт забяспечаны сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання, аб'яднанымі лакальнай сеткай. Практычныя навыкі студэнты набываюць на семінарскіх занятках, вучэбных і вытворчых практыках, у «Юрыдычнай клініцы», дзе яны кансультуюць малазабяспечаных грамадзян.

На факультэце створаны ўсе ўмовы для вучэбнай, навуковай дзейнасці і рэалізацыі творчых здольнасцяў студэнтаў. На працягу навучальнага года праводзяцца студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы навуковых работ, функцыянуе форум на афіцыйным сайце факультэта, дзейнічаюць студэнцкія органы самакіравання, на кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі.

На факультэце штогод праводзіцца Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда, Міжнародны летні ўніверсітэт (сумесны праект юрыдычнага факультэта БДУ, Універсітэта Парыж – Захад – Нантэр-Дэфанс і Універсітэта Патсдам), Міжнародны студэнцкі конкурс па міжнародным гандлёвым праве і міжнародным камерцыйным арбітражы ICC Lex Mercatoria. На базе музея правазнаўства працуе гісторыка-патрыятычны цэнтр «Памяць».

Фонд бібліятэкі юрфака складае звыш 200 тыс. выданняў, у тым ліку і ўнікальных (XVIII – пачатак XX стст.).

Юрыдычны факультэт БДУ сёння – вядучы вучэбны і навуковы цэнтр падрыхтоўкі кадраў прафесіяналаў юрыстаў, здольных паспяхова працаваць як у сваёй краіне, так і за яе межамі. Нашы выпускнікі працуюць у заканадаўчых і выканаўчых органах улады, у судовай сістэме дзяржавы, у праваахоўных органах, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці. Сярод выпускнікоў – міністры, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі НС РБ, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый. Выпускнікі факультэта ўзначальваюць Канстытуцыйны і Вярхоўны суды, Міжнародны арбітражны суд пры Беларускай гандлёва-прамысловай палаце, Міжнародны арбітражны (трацейскі) суд «Палата арбітраў пры Саюзе юрыстаў», Генеральную пракуратуру, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, Дзяржаўны камітэт па маёмасці, Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў, Суд Еўразійскага эканамічнага саюза, Эканамічны суд СНД, Рэспубліканскую калегію адвакатаў, Саюз пісьменнікаў Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў», займаюць кіраўнічыя пасады ў Адміністрацыі Прэзідэнта РБ, Міністэрстве юстыцыі і Следчым камітэце Рэспублікі Беларусь.

Дыплом юрфака БДУ – гарантыя паспяховай кар'еры і максімальнай самарэалізацыі!

***Пётр Міклашэвіч,*** *Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.*

*– Сёння юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта па-ранейшаму застаецца самым прэстыжным у нашай краіне цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй.*



*Высокі ўзровень стандартаў навучання на факультэце заўсёды грунтаваўся на фундаментальных ведах і выключным педагагічным таленце многіх пакаленняў выкладчыкаў, якім сёння мы выказваем шчырыя словы ўдзячнасці і павагі.*

*Немагчыма ўявіць сферу нашага жыцця, дзе б не сцвярджалі законнасць выпускнікі юрыдычнага факультэта. Усталяванне вяршэнства права, развіццё нацыянальнай прававой сістэмы, абарона правоў і інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб – сэнс і аснова штодзённай стваральнай працы юрыстаў, іх уклад у забеспячэнне стабільнасці і дынамічнага развіцця грамадства і дзяржавы.*

***Наталля Карповіч,*** *суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, доктар юрыдычных навук, дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта БДУ.*



*– За гады свайго існавання юрыдычны факультэт БДУ зрабіў унікальны ўнёсак у развіццё прававой навукі і падрыхтоўку юрыдычных кадраў. Яго славу складаюць тысячы выпускнікоў, якія дасягнулі значных поспехаў у сваёй прафесійнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі.*

*Сёння юрыдычны факультэт БДУ з'яўляецца адным з вядучых і самым прэстыжным адукацыйным і навукова-метадычным цэнтрам, выступае надзейнай пляцоўкай для далейшага прафесійнага росту юрыстаў. Прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта вылучае высокая кампетэнтнасць, беражлівыя адносіны да традыцый беларускай юрыдычнай адукацыі і актыўны творчы пошук. Практычная і інавацыйная накіраванасць дзейнасці, актыўнае ўкараненне сучасных тэхналогій і наватарскія падыходы дазваляюць яму ўпэўнена ісці ў нагу з часам.*

# БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – кандыдат біялагічных навук дацэнт Уладзімір Васільевіч ЛЫСАК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 10. Тэл. 209-58-08, 209-59-02, 209-58-05.*
*Факс 209-58-08. E-mail: bio@bsu.by; www.bio.bsu.by*

На факультэце дзейнічаюць 9 кафедраў, 9 навукова-даследчых лабараторый, заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, вучэбная лабараторыя вылічальнай тэхнікі і тэхнічных сродкаў навучання і вучэбна-навуковы цэнтр «Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга». Функцыянуюць 9 філіялаў кафедраў на базе навуковых устаноў Нацыянальнай акадэміі навук, прыродаахоўных устаноў і прамысловых прадпрыемстваў. Працуюць 2 акадэмікі, 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 19 дактароў і 85 кандыдатаў навук.

Навучаюцца больш за 2000 студэнтаў, 20 магістрантаў і 40 аспірантаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў на дзённым аддзяленні вядзецца па 4 спецыяльнасцях: **«Біялогія»** (напрамкі «Навукова-вытворчая дзейнасць», «Навукова-педагагічная дзейнасць» і «Біятэхналогія»), **«Біяэкалогія», «Біяхімія»** і **«Мікрабіялогія».** Студэнты атрымліваюць адну з 6 кваліфікацый: *«Біёлаг», «Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі», «Біёлаг-біятэхнолаг. Выкладчык біялогіі», «Біёлаг-эколаг. Выкладчык біялогіі і экалогіі», «Біёлаг. Біяхімік» і «Біёлаг. Мікрабіёлаг».* На завочным аддзяленні падрыхтоўка вядзецца па спецыяльнасцях «Біялогія» (напрамкі: «Навукова-вытворчая дзейнасць» і «Навукова-педагагічная дзейнасць»), «Біяэкалогія», «Біяхімія» і «Мікрабіялогія».

Дзейнічаюць дзевяць студэнцкіх навуковых гурткоў, чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі: малекулярнай біятэхналогіі; прыкладных праблем раслiннай клеткі і біятэхналогіі раслін; структуры і дынамікі біяразнастайнасці; біяінфарматыкі і малекулярнай эвалюцыі жывёл.

Выпускнікі факультэта могуць працаваць супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, фармацэўтычнай, біяхімічнай, мікрабіялагічнай, ветэрынарнай і харчовай прамысловасці, на прадпрыемствах, якія выпрацоўваюць касметыку, у экспертна-крыміналістычных цэнтрах, у запаведніках, заказніках, нацыянальных парках, батанічных садах, на селекцыйных станцыях, ва ўстановах Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у сістэме Дзяржкамгідрамета, у сертыфікацыйных, экспертна-аналітычных, мытных установах, выкладчыкамі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў і г. д.



Прафесія біёлага – прафесія будучыні!

***Алег Барадзін,*** *генеральны дырэктар Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах», дацэнт. Выпускнік 2000 г.*



*– Біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – гэта ўнікальная школа жыцця, прайшоўшы якую, можна смела называць сябе сапраўдным біёлагам. У свой час мне пашанцавала, і я трапіў у сцены роднага біяфака. Родным ён застаецца і зараз. Менавіта гады студэнцтва канчаткова склалі мой жыццёвы выбар і напрамак маёй спецыялізацыі. Наступнае навучанне ў магістратуры, аспірантуры, потым праца лабарантам, асістэнтам і, нарэшце, дацэнтам кафедры заалогіі канчаткова пераканалі мяне ў правільнасці раней зробленага выбару. Калектыў біёлагаў-прафесіяналаў з вялікім педагагічным вопытам, традыцыі, якія фарміруюцца дзесяцігоддзямі, а таксама навуковыя школы, вялікая колькасць выбітных выпускнікоў, якія ігралі і іграюць зараз ключавыя ролі ў развіцці сучаснай біялогіі і ствараюць імідж і антураж біяфака.*

***Алена Літвінава,*** *начальнік упраўлення інавацыйнага развіцця РУП «Белмедпрэпараты», кандыдат біялагічных навук. Выпускніца 1989 г.*



*– Не магу сказаць, што ў дзяцінстве і юнацтве марыла стаць біёлагам, хоць вельмі любіла прыроду. Прыцягвала прафесія ўрача, хіміка, педагога. Выбар на карысць біялогіі быў заснаваны хутчэй на сямейнай традыцыі: бацькі скончылі біялагічны факультэт БДУ і заставаліся адданымі атрыманай прафесіі ўсё жыццё. Але я ўвогуле не шкадую пра свой выбар! Бо, стаўшы біёлагам, я адначасова стала і хімікам, і педагогам, і нават трохі ўрачом. І нічога дзіўнага ў гэтым няма, бо праграма навучання на факультэце ўключае вялікую колькасць спецыяльных і дадатковых дысцыплін, вывучэнне якіх спрыяе фармаванню не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і ўсебакова развітых асоб. Воляю лёсу пасля працы на факультэце я патрапіла ў рэальны сектар эканомікі – на РУП «Белмедпрэпараты». Зараз узначальваю ўпраўленне інавацыйнага развіцця. Здавалася б, якая сувязь фармацэўтыкі з біялогіяй? Самая непасрэдная! Біялагічная адукацыя дазваляе рэалізаваць сябе і ў гэтай сферы, у прыватнасці, пры вызначэнні падыходаў да распрацоўкі біялагічных і хімічных метадаў кантролю якасці лекаў, да тэхналогій атрымання біялагічна актыўных злучэнняў і прэпаратаў на іх аснове з выкарыстаннем біятэхналагічных працэсаў. А гэтыя веды – вынік навучання на біялагічным факультэце!*

*Жадаю ўсім здароўя і дабрабыту, а роднаму біяфаку – росквіту!*

# ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, намеснік першага прарэктара БДУ па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях Павел Аляксеевіч МАНДРЫК*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 4. Тэл. 209-52-45. Факс 226-55-48.*
*E-mail: dean_office_FPMI@bsu.by; www.fpmi.bsu.by*

ФПМІ заснаваны 1 красавіка 1970 г.

Выкладчыцкі склад налічвае больш за 200 чалавек, сярод якіх акадэмік, член-карэспандэнт НАН Беларусі, 30 прафесараў і дактароў навук, больш за 100 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На 11 кафедрах навучаюцца больш за 1400 студэнтаў дзённай формы навучання.

За час свайго існавання ФПМІ падрыхтаваў амаль 10 тыс. спецыялістаў, якія складаюць кадравую аснову многіх вядучых арганізацый краіны ў галіне інфармацыйных тэхналогій і адпаведных падраздзяленняў прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку з Парка высокіх тэхналогій, банкаў, страхавых кампаній, навуковых і навучальных устаноў.

Спецыяльнасці факультэта: **«Прыкладная матэматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-праграміст»*), **«Інфарматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык – сістэмны праграміст»*), **«Эканамічная кібернетыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-эканаміст»*), **«Актуарная матэматыка»** (кваліфікацыя *«Матэматык-фінансіст»*), **«Камп'ютарная бяспека»** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па ахове інфармацыі. Матэматык»*), **«Прыкладная інфарматыка»** (кваліфікацыя *«Інфарматык. Спецыяліст па распрацоўцы праграмнага забеспячэння»*). Незалежна ад спецыяльнасці выпускнікі ФПМІ могуць займацца аналітычнай, навуковай, кіраўніцкай і практычнай дзейнасцю, звязанай з праектаваннем, распрацоўкай, эксплуатацыяй і суправаджэннем прыкладнога і сістэмнага праграмнага забеспячэння.

Студэнты, якія навучаюцца на першай ступені вышэйшай адукацыі, атрымліваюць фундаментальную матэматычную і праграмісцкую падрыхтоўку (матэматычны аналіз, алгебра і аналітычная геаметрыя, дыскрэтная матэматыка, мовы праграмавання, камп'ютарныя сеткі, базы дадзеных, функцыянальны аналіз, варыяцыйнае вылічэнне, лікавыя метады і інш.), вывучаюць цыкл спецыяльных дысцыплін, што адносяцца да інфарматыкі і матэматычнага мадэлявання (тэорыя алгарытмаў, аптымальнае кіраванне, дынаміка механічных сістэм, тэорыя ўстойлівасці, матэматычная эканоміка, фінансавая матэматыка, тэорыя гульняў і даследаванне аперацый, тэорыя верагоднасцяў і матэматычная статыстыка, тэорыя рызык і інш.).

На другой ступені вышэйшай адукацыі ідзе навучанне па спецыяльнасцях: «Прыкладная матэматыка і інфарматыка», «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі» (кваліфікацыі *«Магістр фізіка-матэматычных навук»*), «Алгарытмы і сістэмы апрацоўкі вялікіх аб'ёмаў інфармацыі», «Прыкладны камп'ютарны аналіз дадзеных» (кваліфікацыі *«Магістр прыкладной матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій»*).

Сучаснае жыццё немагчымае без выкарыстання дасягненняў прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Яны запатрабаваны ў вырашэнні канкрэтных фізічных, эканамічных, фінансавых, сацыяльных, тэхнічных задач, калі змястоўную сутнасць той альбо іншай праблемы трэба перавесці на мову формул і знайсці эфектыўнае рашэнне. Менавіта таму спецыялісты ў галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі запатрабаваныя сучасным жыццём і маюць добрыя перспектывы знайсці цікавую і высокааплатную працу. Факультэт цесна супрацоўнічае і мае афіцыйныя дамовы аб падрыхтоўцы спецыялістаў з Нацыянальным банкам і шматлікімі камерцыйнымі банкамі, з больш як 100 кампаніямі Парка высокіх тэхналогій і іншымі арганізацыямі.

Студэнцкае жыццё насычана яркімі падзеямі. Штогод шырока святкуюцца разам з выкладчыкамі Дні ФПМІ. Ладзяцца канцэрты факультэцкай каманды КВЗ, студэнцкія капуснікі, Дзень першакурсніка і іншыя.

Іншагароднім студэнтам даецца месца ў інтэрнаце, дзе створаны камфортныя ўмовы пражывання: функцыянуюць трэнажорны і більярдны пакоі, відэазалы, сертыфікаваная камп'ютарная сетка, якая дазваляе падключаць камп'ютары непасрэдна да адукацыйных сервераў факультэта з выхадам у інтэрнэт.

На факультэце дзейнічае сістэма бесперапыннай адукацыі, арыентаванай на прадметы «Матэматыка» і «Інфарматыка». Сістэма ўключае пастаянныя школы для юнацтва (пачынаючы з 5 класа сярэдняй школы) і мерапрыемствы алімпіядна-конкурснага і навучальнага характару (алімпіяды, канферэнцыі, вучэбныя зборы featuring рознага ўзроўню і накіраванасці, летнія школы і г. д.).

Запрашаем усіх зацікаўленых на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, а навучэнцаў 5–11-х класаў – у нашыя школы для юнацтва, а таксама ў цэнтр па рабоце з адоранымі школьнікамі («ЮНІцэнтр–XXI»).

Штогод нашы студэнты працуюць у складзе журы розных алімпіяд і конкурсаў для школьнікаў, удзельнічаюць у рэспубліканскіх і міжнародных студэнцкіх алімпіядах па праграмаванні і матэматыцы і дэманструюць высокі ўзровень падрыхтоўкі.

Каманды БДУ ў складзе студэнтаў ФПМІ шматразова былі фіналістамі каманднага чэмпіянату свету па праграмаванні (ACM ICPC), у якім прымаюць удзел каманды звыш 2300 універсітэтаў! Найвышэйшага поспеху наша каманда дасягнула ў 2004 г., калі заваявала залаты медаль, у 2008 г. – бронзавы, а ў 2012 і 2013 гг. – сярэбраныя.

На студэнцкіх алімпіядах па матэматыцы з 2001 г. студэнты ФПМІ заваявалі 78 медалёў (у тым ліку 40 залатых медалёў), а ў 2003 і 2005 гг. узялі першыя месцы ў агульнакамандным спаборніцтве. Нездарма на факультэце вучыліся і вучацца больш за 600 лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, больш за 90 з іх валодаюць найвышэйшай узнагародай спецфонду – нагрудным знакам.

***Аляксей Тузікаў,*** *генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Выпускнік 1980 г.*

*– ФПМІ быў і застаецца сапраўдным лідарам у краіне па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Высокая якасць адукацыі – на ўзроўні самых прэстыжных сусветных стандартаў – заснавана перш за ўсё на высокапрафесійных спецыялістах, якія працуюць на факультэце, але таксама ў вялікай ступені на скрупулёзным адборы абітурыентаў. Усё гэта дазваляе студэнтам ФПМІ дамагацца выдатных вынікаў у сваёй кар'еры: як у навуковай, так і ў прафесійнай. Нездарма попыт на выпускнікоў ФПМІ не проста высокі – у любой арганізацыі (навуковая ўстанова, ВНУ, банк або IT-кампанія) кожны кіраўнік ведае: любы выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі адразу і лёгка ўключаецца ў самую складаную працу і дамагаецца поспеху.*



***Сяргей Гвардзейцаў,*** *заснавальнік кампаніі «Ітранзішн». Выпускнік 1996 г.*



*– ФПМІ – гэта не толькі аснова ўсіх ведаў і ўменняў, атрыманых мной у галіне матэматыкі і інфарматыкі, але часта і крыніца новых ідэй для стварэння новага ў любой галіне: у прыкладной матэматыцы, у IT-сферы, у навуцы, у бізнесе. Так ствралася і мая кампанія – усё пачыналася з навучальнага курса для «прасунутых» студэнтаў, потым на гэтай аснове быў створаны калектыў, які паклаў пачатак існаванню кампаніі пад назвай «Ітранзішн». Зараз гэта вельмі паспяховая кампанія, якая працягвае актыўнае супрацоўніцтва з ФПМІ і бачыць у гэтым адзін з фактараў свайго поспеху. Разам з факультэтам мы пабудавалі некалькі лабараторый, распрацавалі шэраг навучальных курсаў, садзейнічаем развіццю студэнцкага руху ў алімпіядах і навуковай творчасці, а таксама далейшаму працаўладкаванню выпускнікоў.*

# ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар геаграфічных навук дацэнт Дзмітрый Леанідавіч ІВАНОЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16*
*Тэл. 209-52-57. Факс 209-50-15. E-mail: geo@bsu.by; www.geo.bsu.by*

На геаграфічным факультэце існуюць наступныя спецыяльнасці і спецыялізацыі.

**Геаграфія.** Напрамак «Навукова-педагагічная дзейнасць». Спецыялізацыі: геаграфія турызму і экскурсійны менеджмент; эканамічная геаграфія; геаграфія глебаў, зямельныя рэсурсы і меліярацыя; рэгіянальнае кіраванне; біягеаграфія.

Напрамак «Геадэмаграфія».

**Геаінфармацыйныя сістэмы.**

**Гідраметэаралогія.**

**Космааэракартаграфія.**

**Геаэкалогія.** Спецыялізацыі: геаэкалагічныя інфармацыйныя сістэмы; геаэкалагічны менеджмент.

**Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў.** Спецыялізацыі: геалагічная здымка, пошук і разведка радовішчаў карысных выкапняў; гідрагеалогія і інжынерная геалогія.

Выпускнікі геаграфічнага факультэта могуць атрымаць наступныя кваліфікацыі: *«Географ. Выкладчык геаграфіі»* («Геаграфія», напрамак «Навукова-педагагічная дзейнасць»); *«Географ. Геадэмограф»* («Геаграфія», напрамак «Геадэмаграфія»); *«Географ. Гідраметэаролаг»* («Гідраметэаралогія»); *«Спецыяліст па кадастры і геаінфармацыйных сістэмах»* («Геаінфармацыйныя сістэмы»), *«Географ-эколаг. Выкладчык геаграфіі і экалогіі»* («Геаэкалогія»); *«Інжынер-геолаг»* («Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў»), *«Географ. Спецыяліст па картографа-геадэзічнай дзейнасці»* («Космааэракартаграфія»).

Пасля заканчэння ўніверсітэта географы і геаэколагі могуць працаваць у структурных установах Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навукова-даследчых і праектных інстытутах і прадпрыемствах прыродазнаўчага, водагаспадарчага, меліярацыйнага, турысцка-экскурсійнага і сацыяльна-эканамічнага профіляў, а таксама выкладаць геаграфію і экалогію ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.

Кваліфікацыя *«Спецыяліст па кадастры і геаінфармацыйных сістэмах»* адкрывае шырокія магчымасці для атрымання тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі па комплексе дысцыплін, неабходных пры распрацоўцы і прымяненні інфармацыйных тэхналогій у галіне землекарыстання, геадэзіі і картаграфіі. Выпускнікі спецыяльнасці **«Геаінфармацыйныя сістэмы»** і спецыялісты па картографа-геадэзічнай дзейнасці размяркоўваюцца ў сістэму Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі, яго тэрытарыяльных органаў, у падведамасныя навуковыя і вытворчыя прадпрыемствы і арганізацыі («Белгеадэзія», «Белкартаграфія», «Белдзіпразем», «Белаэракосмагеадэзія», «Картгеацэнтр» і інш.), праектныя арганізацыі Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры.

Спецыялісты-гідраметэаролагі праходзяць падрыхтоўку для працы ў сістэме ўпраўлення па гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у навуковых і вытворчых прадпрыемствах і ўстановах.

Інжынеры-геолагі працуюць у структурных падраздзяленнях упраўлення па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, ДП «Белдзяржгеацэнтр», ААТ «Белгархімпрам», у навукова-даследчых і праектных інстытутах геалагічнага профілю.

Спецыялісты па картографа-геадэзічнай дзейнасці будуць працаваць у вытворчых прадпрыемствах і ў арганізацыях Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі («Белгеадэзія», «Белкартаграфія», «Белаэракосмагеадэзія», «Картгеацэнтр» і інш.), праектных арганізацыях Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры.

Спецыялісты-геадэмографы будуць размяркоўвацца ў профільныя ўстановы Мінпрацы, Мінэканомікі і Нацыянальнага статыстычнага камітэта.

***Рыгор Пасрэднік,*** *намеснік начальніка ўпраўлення выхаваўчай працы з моладдзю БДУ.*



*– Калі б я не паступіў на геаграфічны факультэт, маё жыццё напэўна склалася б інакш, ды і я б стаў іншым. Таму што гэта той факультэт, які дае не толькі веды і прафесію – гэта тое месца, якое фарміруе адмысловы жыццёвы погляд на свет – геаграфічны погляд. І, нягледзячы на тое, што я працую не па спецыяльнасці, дагэтуль гляджу на свет вачыма географа, спрабуючы знайсці прычынна-выніковыя сувязі і раскласці ўсё на складнікі, дакапацца да сутнасці. За ўсе 6 гадоў вучобы на геафаку мы вывучалі мноства прадметаў, якія на погляд неазнаёмленага чалавека не маюць дачынення да геаграфіі: фізіка, хімія, культуралогія, вышэйшая матэматыка, гісторыя, астраномія і г. д. Але толькі географ разумее, што без звестак з усіх галін навук немагчыма ведаць геаграфію. І гэта невымоўнае пачуццё разумення і ўсведамлення навакольнага свету, яго памераў і формаў, яго гісторыі і далейшага лёсу. Геаграфія знаходзіцца на стыку навук, гэта ўсё, што мы бачым вакол сябе. Акрамя таго, геаграфія дае магчымасць зразумець сваё месца ў гэтым велізарным сусвеце, зразумець сваю значнасць і свае магчымасці. І я ўдзячны геаграфічнаму факультэту за тое, што ён даў магчымасць крышачку зразумець сябе і знайсці сябе ў навакольным свеце. Дагэтуль я не страціў цікавасць да геаграфіі, мне цікава чытаць кнігі, вар'яцка цікава падарожнічаць, і калі доўгі час я не знаходжуся ў дарозе, то ў мяне з'яўляецца непераадольнае жаданне сарвацца з месца і куды-небудзь паехаць. Напэўна, у маёй душы яшчэ не згас той агонь хлапчука, ахвотніка прыгод і адкрыццяў, які запаліўся пры знаёмстве з геаграфіяй і з яшчэ большай сілай разгарэўся ў сценах геаграфічнага факультэта БДУ.*

# ФАКУЛЬТЭТ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

*Дэкан – кандыдат тэхнічных навук дацэнт Уладзімір Яўгенавіч ГУРСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 209-59-11.*
*E-mail: info@fsk.bsu.by; www. gumf.bsu.by*

Факультэт сацыякультурных камунікацый ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасцях: **«Дызайн»** (напрамак «Камунікатыўны дызайн»); **«Сучасныя замежныя мовы»** (напрамак «Пераклад»; напрамак «Выкладанне» – спецыялізацыі «Камп'ютарная лінгвістыка» і «Камп'ютарнае навучанне мовам»); **«Прыкладная інфарматыка»** (напрамак «Вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн»); **«Сацыяльная работа»** (напрамак – «Сацыяльнае праектаванне»); **«Культуралогія»** па напрамках: «Культуралогія фундаментальная» (спецыялізацыі «Амерыканістыка і англійская мова», «Гебраістыка і англійская мова», «Германістыка і нямецкая мова»); **«Культуралогія прыкладная»** (спецыялізацыі «Менеджмент рэкламы і грамадскіх сувязяў», «Менеджмент міжнародных культурных сувязяў»); **«Менеджмент»** (напрамак «Сацыяльна-адміністратыўны менеджмент»).

На ўсіх спецыяльнасцях студэнты паглыблена вывучаюць камп'ютарныя тэхналогіі, а таксама замежныя мовы.

Пры падрыхтоўцы дызайнераў асаблівая ўвага надаецца безаналагаваму інавацыйнаму праектаванню, развіццю навыкаў творчага падыходу да праектавання штучнага асяроддзя. Спецыяліст у галіне дызайну мае права займаць такія пасады, як мастак кніжнай графікі, мастак па рэкламе, дызайнер віртуальнага асяроддзя, дызайнер медыйных тэхналогій, дызайнер лічбавай фатаграфіі, вэб-дызайнер, дызайнер малых архітэктурных формаў, мастак-канструктар (дызайнер).

Будучыя спецыялісты па камп'ютарным навучанні мовам змогуць не толькі выкладаць замежную мову, але і быць аўтарамі камп'ютарных курсаў па навучанні мове. Яны могуць займаць пасады выкладчыка, малодшага навуковага супрацоўніка, перакладчыка, рэдактара-перакладчыка, рэдактара-стыліста і інш.

Спецыяліст, які атрымаў падрыхтоўку па спецыяльнасці перакладчык, будзе вольна валодаць замежнай мовай (англійскай, нямецкай); зможа рабіць тэксты перакладу неабходных матэрыялаў; будзе валодаць навыкамі падрыхтоўкі неабходных дакументаў на замежнай мове, а таксама навыкамі арганізацыі і правядзення дзелавых перамоў з замежнымі партнёрамі і афармлення адпаведнай дакументацыі; зможа ўдзельнічаць у якасці рэферэнта-перакладчыка ў працы выстаў, канферэнцый, сімпозіумаў і іншых мерапрыемстваў з замежнымі партнёрамі; весці падрыхтоўку спецыялістаў па замежнай мове.

Напрамак «Вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн» прадугледжвае вывучэнне такіх асноўных дысцыплін, як праграмаванне, камп'ютарны дызайн, праектаванне і распрацоўка вэб- і мабільных дадаткаў для розных платформаў, а таксама дысцыплін мастацкага кірунку. Спецыяліст можа займаць пасады інжынера-праграміста, інжынера-даследчыка, малодшага навуковага супрацоўніка і інш.

Вядзецца падрыхтоўка сучасных сацыяльных работнікаў, спецыялістаў, якія маюць высокую псіхалагічную кампетэнцыю, спецыяльныя веды ў галіне сацыяльнай інжынерыі і тэхналогій, прававых, псіхалагічных і маральных асаблівасцяў жыццядзейнасці чалавека. Спецыяліст у галіне сацыяльнага праектавання можа працаваць на ўстановах адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнай абароны, у грамадскіх аб'яднаннях і прыватным бізнесе.

Атрыманне адукацыі па спецыяльнасці «Культуралогія (па напрамках)» ажыццяўляецца ў межах некалькіх спецыялізацый: «Менеджмент міжнародных культурных сувязяў», «Менеджмент рэкламных і грамадскіх сувязяў», «Амерыканістыка і англійская мова», «Гебраістыка і англійская мова», «Германістыка і нямецкая мова». Спецыяльнасць скіраваная на падрыхтоўку менеджараў па сувязях з грамадскасцю, спецыялістаў у сферы кіравання культурай, менеджараў міжнародных культурных сувязяў. Высокі ўзровень прафесіяналізму і кампетэнцыі, заснаваны на веданні ўласнай культуры, міжкультурных адрозненняў, на здольнасцях аналізаваць, прагназаваць і кіраваць сацыякультурнымі працэсамі – адна з адметных рысаў спецыяльнасці.

Менеджар-эканаміст – гэта спецыяліст з рознабаковай эканамічнай і прававой падрыхтоўкай. Такія спецыялісты запатрабаваны ў навуковых арганізацыях, кансультацыйных фірмах, аналітычных падраздзяленнях устаноў і прадпрыемстваў, органах сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, сферы паслуг.

***Паліна Хонькіна,*** *выпускніца 2011 г. спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (камп'ютарная лінгвістыка)». Лаўрэат стыпендыі імя Кандрата Крапівы, старшыня савета па якасці адукацыі БДУ, член Савета БДУ.*



*– ФСК прапануе інавацыйныя спецыяльнасці, вельмі запатрабаваныя на рынку працы. Матэрыяльна-тэхнічная база, спрыяльная атмасфера і абачлівае кіраўніцтва ствараюць добрыя ўмовы для плённай дзейнасці студэнтаў. Калі б мне далі яшчэ адзін шанец выбраць ВНУ і факультэт, я б не раздумваючы зноў выбрала БДУ і толькі факультэт сацыякультурных камунікацый.*

***Вольга Паўлюць,*** *выпускніца спецыяльнасці «Менеджмент» (напрамак «Сацыяльна-адміністрацыйны менеджмент»), найлепшы выпускнік БДУ–2016, член банка дадзеных адоранай моладзі.*



*– Кожны дзень на ФСК быў для мяне яркай, эмацыйнай падзеяй. Спрыяла гэтаму як студэнцкае асяроддзе, так і калектыў супрацоўнікаў. Лічу, што навучанне ва ўніверсітэце – гэта рэалізацыя духоўнага патэнцыялу асобы, станаўленне творцы і носьбіта культурных традыцый, нараджэнне прафесіянала. І ФСК БДУ дапамог мне скласці ўсе гэтыя часткі ў гарманічную і апрабаваную сістэму жыццёвых правіл і звычак.*

# ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

*Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20. Тэл. 209-59-77. Факс 209-57-42.*
*E-mail: fir@bsu.by; www.fir.bsu.by*

ФМА створаны 1 кастрычніка 1995 г. Тут навучаецца 2,3 тыс. студэнтаў, у тым ліку 450 замежных грамадзян. ФМА падрыхтаваў звыш 4 тыс. спецыялістаў. 30 % супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў Беларусі з'яўляюцца выпускнікамі факультэта.

На кафедрах працуюць вядомыя навукоўцы, адзначаныя прэстыжнымі айчыннымі і міжнароднымі ўзнагародамі, рэгулярна выступаюць з лекцыямі вядучыя айчынныя і замежныя эксперты.

Спецыяльнасць **«Міжнародныя адносіны».**

Спецыялізацыі: знешняя палітыка і дыпламатыя, міжнародныя арганізацыі, арганізацыя міжнародных сувязяў.

Падрыхтоўка прадугледжвае вывучэнне сучаснай міжнароднай палітыкі, эканомікі і права, базавых прынцыпаў і напрамкаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў. Студэнты паглыблена вывучаюць дзве замежныя мовы. Даецца кваліфікацыя *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моў)».* Выпускнікі працуюць у Міністэрстве замежных спраў, іншых міністэрствах і ведамствах Рэспублікі Беларусь, знешнегандлёвых падраздзяленнях беларускіх прадпрыемстваў, СМІ, прадстаўніцтвах міжнародных арганізацый і замежных кампаній.

Спецыяльнасць **«Міжнароднае права».**

Спецыялізацыі: міжнароднае публічнае права, міжнароднае прыватнае права, еўрапейскае права.

Даецца кваліфікацыя *«Юрыст-міжнароднік з веданнем замежных моў (з указаннем дзвюх замежных моў)».* Гэта спецыялісты шырокага юрыдычнага профілю, якія маюць уяўленне пра сусветны правапарадак, свабодна валодаюць сучаснымі метадамі аналізу і вырашэння прававых праблем на публічным узроўні (паміж дзяржавамі) і прыватным узроўні (паміж замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі), могуць аргументавана абгрунтоўваць сваю пазіцыю па міжнародна-прававой праблематыцы. Выпускнікі запатрабаваны ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання, міжнародных арганізацыях і ўстановах, а таксама на прадпрыемствах, якія ажыццяўляюць знешнеэканамічную дзейнасць, у беларускіх і міжнародных юрыдычных фірмах.

Спецыяльнасць **«Лінгвакраіназнаўства».**

Лінгвакраіназнаўства – спецыяльнасць, прызначаная для падрыхтоўкі спецыялістаў шырокага профілю па ўсходазнаўчых дысцыплінах.

Студэнты атрымліваюць глыбокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку па адной з усходніх моў, гісторыі, палітыцы, эканоміцы, геаграфіі і культуры краіны, мову якой вывучаюць (Кітай, Карэя, Турцыя, Японія, Іран, арабскія краіны).

Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю *«Усходазнаўца-міжнароднік. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моў)».* Такія спецыялісты могуць працаваць не толькі перакладчыкамі, але і кансультантамі па адпаведнай краіне і рэгіёне, а таксама выкладчыкамі адной з усходніх моў, рускай мовы як замежнай.

Спецыяльнасць **«Сусветная эканоміка».**

Спецыялізацыі: кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю, знешнегандлёвая і камерцыйная дзейнасць.

Студэнты вывучаюць механізм функцыянавання сусветнай эканомікі і міжнародных эканамічных адносін, міждзяржаўнай і рэгіянальнай палітыкі, а таксама дзейнасць міжнародных эканамічных і фінансавых арганізацый. Выпускнікі могуць працаваць у міждзяржаўных органах, замежных прадстаўніцтвах, міжнародных фінансава-эканамічных арганізацыях, транснацыянальных кампаніях, а таксама міністэрствах і ведамствах, якія займаюцца распрацоўкай і правядзеннем макраэканамічнай і знешнеэканамічнай палітыкі. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю *«Эканаміст».*

Спецыяльнасць **«Менеджмент».** Напрамак спецыяльнасці – «Менеджмент (у сферы міжнароднага турызму)».

Спецыялізацыі: менеджмент уязнога і выязнога турызму, менеджмент агра- і экалагічнага турызму, менеджмент гасціннасці.

Папулярнасць гэтай спецыяльнасці сярод моладзі расце з кожным годам. Студэнты вывучаюць цэлы шэраг дысцыплін, звязаных з сусветнай і нацыянальнай эканомікай, сацыяльным развіццём грамадства, арганізацыяй прадпрымальніцтва, выкарыстаннем культурна-гістарычнай і прыроднай спадчыны ў развіцці міжнароднага турызму. Выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю *«Менеджар-эканаміст. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем дзвюх замежных моў)».* Гэта дае ім магчымасць паспяхова працаваць як у розных кірунках турыстычнай індустрыі, так і ў знешнеэканамічных падраздзяленнях прадпрыемстваў і арганізацый, міжнародных структурах.

Спецыяльнасць **«Мытная справа».**

Спецыялізацыі: прававое забеспячэнне мытнай дзейнасці, эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці, мытная лагістыка. Студэнты атрымліваюць спецыяльныя веды па вядзенні мытнай, знешнегандлёвай і лагістычнай дзейнасці, паглыблена вывучаюць дзве замежныя мовы. Даецца кваліфікацыя *«Спецыяліст мытнай справы».*

Выпускнікі запатрабаваныя ў мытных органах, дзяржаўных і камерцыйных структурах, якія ажыццяўляюць дзейнасць у мытнай сферы, падтрымліваюць знешнеэканамічныя сувязі, у сферы міжнароднай лагістыкі.

***Павел Слюнькін,*** *выпускнік спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» 2011 г. Працуе трэцім сакратаром аддзела візітаў Службы дзяржаўнага пратакола МЗС Беларусі.*

*– Падчас навучання на факультэце міжнародных адносін у мяне была выдатная магчымасць атрымаць неабходныя веды і аналітычныя навыкі, якія потым вельмі спатрэбіліся напачатку маёй працы ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі. Важны адбітак пакінулі вучэбныя курсы, якія былі прысвечаныя палітычным і эканамічным праблемам розных краін і рэгіёнаў свету. Яшчэ адным складнікам навучання стала авалоданне дзвюма замежнымі мовамі, якія выкладаюцца на ФМА на высокім узроўні. У нас вучаць эфектыўна камунікаваць з прадстаўнікамі розных культур і традыцый, што вельмі істотна для вядзення паспяховых перамоў, наладжвання міжнародных сувязяў. Творчая атмасфера на факультэце дазваляе ўдасканальваць прафесійныя і асабістыя якасці, уменне працаваць у калектыве, самастойна прымаць важныя рашэнні і своечасова іх выконваць. Таму магу сказаць, што навучанне на «міжнародных адносінах» – гэта найлепшы выбар для тых, хто здольны хутка рэагаваць на выклікі, браць на сябе адказнасць, камунікаваць з людзьмі з іншых краін і рэгіёнаў, весці вельмі цікавы лад жыцця.*



***Таццяна Міхалёва,*** *выпускніца спецыяльнасці «Міжнароднае права» 2001 г., саветнік экспертна-аналітычнага аддзела сакратарыята Суда Еўразійскага эканамічнага саюза.*



*– Адукацыя, якую дае факультэт па спецыяльнасці «Міжнароднае права», унікальная. Студэнты атрымліваюць веды і нацыянальнага права, і міжнароднага і, вядома, важкі моўны базіс: як мінімум 2 актыўныя замежныя мовы. Выкарыстоўвайце ўсе магчымасці сваёй самай радаснай пары – студэнцтва: удзельнічайце ў конкурсах, канферэнцыях, стажыроўках, пашырайце і паглыбляйце свае веды!*

# ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Дзмітрый Вадзімавіч СВІРЫДАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14. Тэл. 209-52-53. Факс 226-49-98.*
*E-mail: chem@bsu.by; www.chemistry.bsu.by*

Хімічны факультэт, заснаваны ў 1931 г., з'яўляецца вядучым вучэбна-навуковым цэнтрам па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў. Нашы выпускнікі працуюць у навукова-даследчых і праектных інстытутах, вышэйшых навучальных установах, на многіх прадпрыемствах хімічнай, фармацэўтычнай, мікраэлектроннай прамысловасці. Шмат хімікаў-даследчыкаў і хімікаў-педагогаў працуе за мяжой у вядучых універсітэтах і фірмах, дзейнасць якіх звязана з хіміяй.

У структуры факультэта 9 кафедраў, на якіх працуюць 2 акадэмікі, 2 члены-карэспандэнты, 26 дактароў і 86 кандыдатаў навук. Факультэт плённа супрацоўнічае з НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, інстытутамі НАН Беларусі, дзе арганізаваны спецыялізаваныя практыкумы і студэнты знаёмяцца з перадавымі даследаваннямі, выконваюць курсавыя і дыпломныя працы, удзельнічаюць у выкананні навуковых тэм.

З 2013 г. на хімічным факультэце арганізавана падрыхтоўка па трох новых спецыяльнасцях: **«Фундаментальная хімія», «Хімія высокіх энергій»** і **«Хімія лекавых злучэнняў».** Адначасова захаваны прыём па традыцыйнай для факультэта спецыяльнасці **«Хімія»** па чатырох напрамках: навукова-вытворчая дзейнасць, фармацэўтычная дзейнасць, навукова-педагагічная дзейнасць, ахова навакольнага асяроддзя. У залежнасці ад абранай спецыяльнасці выпускнікі атрымліваюць адну з кваліфікацый: *«Хімік. Даследчык», «Хімік. Інжынер», «Хімік. Выкладчык хіміі», «Хімік. Хімік-эколаг», «Хімік. Хімік-фармацэўт», «Хімік. Радыяцыйны хімік. Радыяхімік», «Хімік. Біяфармахімік».*

Навучальны працэс на хімічным факультэце скіраваны на развіццё творчага патэнцыялу студэнтаў, уменне самастойна будаваць сваю адукацыйную траекторыю, пастаянна папаўняць і абнаўляць свае прафесійныя кампетэнцыі. Таму многія нашы выпускнікі сталі не толькі буйнымі навукоўцамі і арганізатарамі вытворчасці, але і прадпрымальнікамі, дыпламатамі, крыміналістамі, менеджарамі, а гэта значыць, што яны лёгка ўвайшлі ў іншыя сферы дзейнасці і дасягнулі ў іх знакавых поспехаў.

У апошнія гады выканана рэканструкцыя корпуса хімічнага факультэта, закуплена новае абсталяванне для навучальных практыкумаў. Факультэт мае сучасныя вучэбныя лабараторыі, тры камп'ютарныя класы, уласную бібліятэку. Дзейнічаюць чатыры студэнцкія НДЛ.

Выпускнікі хімфака маюць шырокія магчымасці ў выбары сваёй прафесійнай дзейнасці ў НАН Беларусі, даследчых і інжынерных цэнтрах прадпрыемстваў, хімічных лабараторыях буйных прамысловых аб'яднанняў фармацэўтычнай і радыёэлектроннай прамысловасці, на Беларускай АЭС, а таксама ўсюды, дзе выкарыстоўваюцца хімічныя тэхналогіі. І не толькі ў Беларусі. Тыя, хто схільны да выкладчыцкай дзейнасці, могуць рэалізаваць сябе ў навучальных установах. Мы чакаем вас на хімічным факультэце. Вы не пашкадуеце, калі прыйдзеце вучыцца да нас.





***Кацярына Скорб,*** *дацэнт кафедры неарганічнай хіміі, кандыдат хімічных навук, лаўрэат прэзідэнцкай стыпендыі маладым вучоным. Скончыла хімічны факультэт у 2006 годзе, абараніла кандыдацкую дысертацыю ў 2009 годзе.*

*– Хімфак – гэта вялізны калектыў высокапрафесійных выкладчыкаў, гэта верныя і добрыя сябры на ўсё жыццё, гэта САПРАЎДНАЯ спецыяльнасць. Зараз сфер прыкладання хімікаў велізарная колькасць – гэта і эколагі, і фармацэўты, і настаўнікі, і інжынеры, і даследчыкі, і многія іншыя. Але самае галоўнае тое, што хімічны факультэт – скарбніца магчымасцяў, якія адкрываюцца перад табой па яго заканчэнні. Ты малады, разумны і мэтанакіраваны – перад табой адкрыты ўсе гарызонты. Далучайся да каманды ўніверсітэцкіх хімікаў!*



***Дзмітрый Шчукін,*** *прафесар Ліверпульскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія).*

*– Для многіх з нас хімічны факультэт БДУ, які мне пашчасціла скончыць у 1998 г., стаў выдатнай школай, якая зрабіла з нас кампетэнтных і інтэлігентных людзей, здольных шмат чаго дасягнуць у жыцці. Хімік – гэта не проста прафесія. Гэта хобі, гэта пакліканне, а для большасці з нас гэта само жыццё. Дзе б ні працаваў хімік, кім бы ён ні быў, яго вылучае розум, напорыстасць, мэтанакіраванасць і незвычайнае ўменне выйсці пераможцам з любой сітуацыі. Так навучылі нас нашыя выкладчыкі. Хімфак – гэта вялікая сям'я, поўная добразычлівасці і паважлівых адносін, якія вы цалкам зможаце адчуць, паступіўшы на хімічны факультэт БДУ.*

# ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК

*Дэкан – кандыдат гістарычных навук дацэнт Вадзім Францавіч ГІГІН*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9. Тэл./факс 259-70-47.*
*E-mail: phse@bsu.by; www.ffsn.bsu.by*

ФФСН вядзе навучанне па дзённай форме – філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, сацыяльных камунікацый і завочнай форме – філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі (другая вышэйшая адукацыя).

На аддзяленні **філасофіі** вядзецца падрыхтоўка па спецыялізацыях «Анталогія і тэорыя пазнання», «Сацыяльная філасофія», «Філасофія культуры».

Студэнты аддзялення атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку ў галіне прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навук, авалодваюць ведамі па гісторыі філасофіі і культуры, тэорыі і метадалогіі пазнання, сацыяльнай філасофіі, логіцы, псіхалогіі, шырокім коле напрамкаў сучаснай філасофіі. Даецца кваліфікацыя *«Філосаф. Выкладчык філасофіі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін».*

На аддзяленні **сацыялогіі** вядзецца падрыхтоўка па спецыялізацыях «метадалогія і метады сацыялагічнага даследавання», «сацыялогія кіравання». Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «палітычная сацыялогія». Спецкурсы прысвячаюцца вывучэнню праблем сацыялогіі працы, кіравання, выхавання, культуры, адукацыі і г. д. Вялікая ўвага надаецца вывучэнню дысцыплін матэматычнага цыкла, агульнай і сацыяльнай псіхалогіі. Даецца кваліфікацыя *«Сацыёлаг. Выкладчык сацыялогіі і сацыяльна-палітычных дысцыплін».*

Аддзяленне **псіхалогіі** забяспечвае падрыхтоўку па спецыялізацыях «Медыцынская псіхалогія» і «Сацыяльная псіхалогія». Даецца кваліфікацыя *«Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі».*

Медыцынскія псіхолагі атрымліваюць спецыяльныя веды па нейрапсіхалогіі, псіхасаматыцы, псіхафармакалогіі, псіхалогіі паводзін з адхіленнямі, анамаліях псіхічнага развіцця дзіцяці, яго дыягностыцы і карэкцыі. Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «Псіхалогія здароўя», дзе акцэнт будзе зроблены на навучанне метадам прафілактыкі захворванняў, фарміраванне здаровага ладу жыцця, пазбаўленне ад шкодных звычак.

Сацыяльныя псіхолагі вывучаюць сучасныя праблемы сусветнай сацыяльнай псіхалогіі, псіхалогіі працы і кіравання, псіхалогіі камунікацый, псіхалагічныя асновы работы з кадрамі, а таксама авалодваюць навыкамі правядзення сацыяльна-псіхалагічнага трэнінгу, сямейнага кансультавання. Мяркуецца адкрыццё спецыялізацыі «Арганізацыйная псіхалогія», дзе акцэнт будзе зроблены на прымяненне псіхалагічных тэорый і даследчых методык да праблем арганізацыі, кіравання і бізнесу, пытанні падбору персаналу, матывацыі, навучання і развіцця супрацоўнікаў, арганізацыйных паводзін і інш.

Аддзяленне **сацыяльных камунікацый** вядзе падрыхтоўку па спецыяльнасці «Сацыяльныя камунікацыі». Даецца кваліфікацыя *«Спецыяліст па сацыяльных камунікацыях».*

На аддзяленні атрымліваюць спецыяльныя веды па арганізацыйнай і маркетынгавай камунікацыі, рэкламнай і выставачнай дзейнасці, PR, медыяпланаванні, механізмах масавых паводзін, у тым ліку паводзін спажыўцоў, эфектыўных формах фарміравання попыту і прасоўвання тавараў і інш.




На факультэце традыцыйна святкуюцца Дзень першакурсніка, Дзень студэнта, Дзень факультэта, Дзень нараджэння ўніверсітэта, выбіраюцца Міс і Містар ФФСН. Штогод праводзяцца турніры па футболе, валейболе, шахматах, восеньскі турыстычны злёт.

Традыцыйнымі сталі навуковыя канферэнцыі, якія прыцягваюць мноства слухачоў і ўдзельнікаў з іншых факультэтаў і ўніверсітэтаў.

Студэнты і аспіранты ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах «Эразмус Мундус», «Капернікус», праектах Вышаградскай групы і інш.

Шматлікія культурныя, спартыўныя, адукацыйныя і навуковыя студэнцкія мерапрыемствы складаюць прэстыж факультэта на ўніверсітэцкім, рэспубліканскім і міжнародным узроўні. Найбольш значнымі з іх з'яўляюцца турзлёт, Дзень першакурсніка, фэст кароткаметражнага кіно, «Містар і Міс ФФСН», міжнародныя навуковыя канферэнцыі, навукова-тэарэтычныя семінары і сімпозіумы.

Студэнты і аспіранты факультэта актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных праграмах і праектах.

***Дыяна Аўсюкевіч,*** *аспірантка ФФСН, лаўрэат стыпендыі імя К. Крапівы.*




*– Адукацыя – гэта не вынік, а працэс. Універсітэт закліканы не выдаваць гатовыя вынікі, а спрыяць фарміраванню ўстойлівай пазіцыі і рэфлексіўнага стаўлення да сябе і навакольнага свету. Гады вучобы ў БДУ прайшлі менавіта так: мы пазнавалі сябе, сталелі, атрымлівалі веды і прагнулі знайсці ім найбольш эфектыўнае прыкладанне. Вельмі хутка надыдзе момант, калі мы зможам нарэшце праверыць ККД нашых высілкаў, але сумненняў у поспеху насамрэч практычна няма. Здаровыя амбіцыі, творчая энергія і непахісная вера ва ўласныя сілы – гэтыя якасці сёння для нас з'яўляюцца не абавязковымі пунктамі ў рэзюмэ, а рэальным багажом, назапашаным за гады вучобы ў БДУ!*

# ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Міхайлавіч КАВАЛЁЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 227-60-25, 217-83-52.*
*E-mail: economics@economy.bsu.by; www. economy.bsu.by*

Эканамічны факультэт заснаваны 1 сакавіка 1999 г. і працягвае слаўныя традыцыі падрыхтоўкі эканамістаў у БДУ – у 1925 г. менавіта эканамісту быў выдадзены дыплом БДУ № 1. Сёння на факультэце на ўсіх формах навучаюцца каля 2,5 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў. Вучацца не толькі беларусы, але і амаль 500 замежных грамадзян з 20 краін свету. На 8 кафедрах працуюць 97 штатных выкладчыкаў, з якіх 12 прафесараў і дактароў навук, 40 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Па сумяшчальніцтве на факультэце працуе шэраг вядомых навукоўцаў-практыкаў, кіраўнікоў і вядучых спецыялістаў міністэрстваў, банкаў, дзяржаўных устаноў, кансалтынгавых фірмаў.

Абітурыенты паступаюць на адну з 5 спецыяльнасцяў: **эканамічная тэорыя** (кваліфікацыя *«Эканаміст. Выкладчык эканамічных дысцыплін»*), **эканоміка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-аналітык»*), **эканамічная інфарматыка** (кваліфікацыя *«Эканаміст-інфарматык»*), **фінансы і крэдыт** (напрамкі «фінансы» і «банкаўская справа», кваліфікацыя *«Эканаміст»*), **менеджмент** (напрамкі «Міжнародны менеджмент», «Інавацыйны менеджмент», кваліфікацыя *«Менеджар-эканаміст»*). На ўсіх спецыяльнасцях тэрмін навучання – 4 гады.

Першыя два гады ўсе студэнты атрымліваюць фундаментальную эканамічную (макра-, мікра-, агра-, міжнародная, рэгіянальная эканоміка), фінансавую (бухулік і аўдыт, карпаратыўныя фінансы, бізнес-планаванне, інвестыцыйны аналіз), а таксама інструментальную (матэматыка, інфарматыка, базы дадзеных, статыстыка, эканаметрыка, метады прыняцця рашэнняў, лагістыка) падрыхтоўку.

Паглыбленае тэарэтычнае і практычнае навучанне працягваецца на III–IV курсах у адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю, яе напрамкам і спецыялізацыяй. Пасля атрымання дыплома можна працягваць навучанне на магістарскіх праграмах, па навуковым і прыкладным напрамках. Выпускнікі з дыпломам магістра навук могуць паступіць у аспірантуру, абараніць дысертацыю і папоўніць эліту нацыянальнай эканамічнай навукі. На эканамічным факультэце шмат увагі надаецца вывучэнню англійскай мовы, аднак зацікаўленыя могуць вывучаць французскую, італьянскую, нямецкую, іспанскую мовы як мовы нашых важных гандлёвых партнёраў. Многія студэнты навучаюцца адзін ці два семестры за мяжой у рамках праектаў «Эразмус Мундус», прымаюць удзел у сумесных праектах кшталту «Нямецкія інвестыцыі ў Беларусі» (з Анхальцкім універсітэтам прыкладных навук, ФРГ), «Беларусь–Галандыя: знешнеэканамічнае супрацоўніцтва і лагістыка» (з Інстытутам менеджменту FONTYS, Галандыя), а таксама ў праектах з універсітэтамі Магдэбурга, Франкфурта (ФРГ), Балонні (Італія). Мы супрацоўнічаем з эканамічнымі факультэтамі МДУ і Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэтаў, Вільнюскага ўніверсітэта, Кіеўскай школай эканомікі і інш.

На факультэце па замове шэрагу фірмаў, банкаў, прадпрыемстваў актыўна займаюцца навукова-практычнай работай у галіне бізнес-планавання, кансалтынгу, электроннага бізнесу, маркетынгу, лагістыкі. Працуе студэнцкі навуковы цэнтр, створаны разам з Банкам развіцця. Мы маем уласныя карпункты часопісаў «Вестник Ассоциации белорусских банков», «Банкаўскі веснік», «Финансы, учет, аудит», «Новая экономіка».

Дапаможа выпускнікам адаптавацца да практычнай работы вучэбная і вытворчая практыка па статыстыцы, фінансах, макра- і мікраэканоміцы, міжнародным менеджменце – як у дзяржаўных установах, так і на найлепшых айчынных і замежных прадпрыемствах, у фірмах і банках. Такое ўзаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі дазваляе яшчэ задоўга да заканчэння ўніверсітэта наладзіць кантакт і знайсці месца працы, якое найбольш адпавядае здольнасцям выпускніка. Добра падрыхтаванаму эканамісту няцяжка знайсці працу, але мы ставім больш складаную задачу: дапамагчы нашым выхаванцам знайсці цікавую і высокааплатную працу.

**Эканамічны факультэт – элітарны факультэт для здольных і энергічных абітурыентаў. Наш лозунг: «Мы разумных робім багацейшымі, а багатых – разумнейшымі».**



***Андрэй Гусеў***, *выпускнік 2006 г., генеральны дырэктар ААТ «Сек'юрыціз» (Расія, СПб).*

*– Адукацыя на эканамічным факультэце мае больш высокі ўзровень, чым у іншых ВНУ Беларусі і Расіі. Гэта абумоўлена як якасцю матэматычнай падрыхтоўкі студэнтаў, так і значным упорам на самаадукацыю. Хоць эканоміка навука гуманітарная, яна памылкова лічыцца недакладнай шматлікімі ВНУ, якія складаюць план навучання студэнтаў. І гэты фактар з'яўляецца вызначальным як у кар'ернай перспектыве выпускнікоў, так і ў выніковым успрыманні якасці ВНУ кадравымі службамі прадпрыемстваў. На практыцы эфектыўнасць эканаміста залежыць ад яго здольнасці вызначаць дакладную меру ў кіраванні эканамічнымі аб'ектамі і працэсамі. Бо памылкі ў кіраванні эканамічнымі працэсамі, напрыклад, запазычанне па высокай стаўцы ў валюце, прыводзяць да таго, што дзяржава губляе сродкі. Менавіта здольнасці вызначаць меру вучаць такія дысцыпліны, як матэматычная статыстыка, эканаметрыка, матэматычныя метады ў эканоміцы, тэорыя гульняў, тэорыя верагоднасцяў і г. д.*



***Анастасія Смелая***, *выпускніца 2011 г., аналітык кампаніі фінансавага і інвестыцыйнага аналізу «Праметэя» (Італія).*

*– Эканамічны факультэт у асобе яго выкладчыкаў даў мне не толькі ўнікальную магчымасць атрымаць фундаментальныя веды ў галіне эканомікі і фінансаў, але таксама дапамог пашырыць мой далягляд у сумежных дысцыплінах, сфарміраваўшы тым самым унікальны лад аналітычнага мыслення, які ў далейшым дазволіў мне скончыць магістратуру Балонскага ўніверсітэта і пачаць кар'еру ў адной з найлепшых кампаній Італіі.*

***Юлія Баранава***, *выпускніца 2011 года, эканаміст, Банк Англіі (Лондан, Вялікабрытанія).*

*– Навучаючыся на эканамічным факультэце БДУ, я атрымала веды і навыкі, якія дазволілі мне паступіць і паспяхова скончыць адну з вядучых магістарскіх праграм па эканоміцы і фінансах у свеце і якія я штодня выкарыстоўваю ў сваёй прафесійнай дзейнасці. Эканамічны факультэт БДУ – гэта ўнікальнае спалучэнне таленавітых выкладчыкаў і студэнтаў, фундаментальных і прыкладных дысцыплін, што робіць яго ідэальнай адпраўной кропкай для маладых людзей, нацэленых на кар'еру ў галіне эканомікі і фінансаў.*

# ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар філалагічных навук прафесар Іван Сямёнавіч РОЎДА*
*Адрас: г. Мінск, вул. К. Маркса, 31. Тэл. 222-34-21, 222-36-02.*
*E-mail: phyl@bsu.by; www. philology.bsu.by*

Падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў ва ўніверсітэце пачалася ў год яго заснавання: 12 жніўня 1921 г. быў аб'яўлены прыём на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук. Праз год былі створаны педагагічны факультэт з літаратурна-лінгвістычным аддзяленнем у яго структуры. Адкрыццё самастойнага філалагічнага факультэта адбылося ў 1939 г.

У даваенны час на філфаку вучыліся такія вядомыя паэты, як П. Броўка, П. Глебка, С. Дарожны, А. Звонак, Т. Кляшторны, Кандрат Крапіва. У пасляваенныя гады нашымі студэнтамі былі будучыя народныя пісьменнікі Беларусі І. Мележ, Н. Гілевіч, І. Навуменка, Р. Барадулін, акадэмікі А. Падлужны, А. Жураўскі, члены-карэспандэнты НАН Беларусі А. Булыка, А. Лойка і інш. Некаторыя з іх працавалі на родным для іх факультэце выкладчыкамі.

На факультэце навучаецца больш за 1,5 тыс. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў з Беларусі і з-за мяжы. Навучальны працэс забяспечваюць 16 кафедраў, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору, 12 спецыялізаваных кабінетаў: беларускай, рускай, украінскай, польскай, чэшскай, славацкай, сербскай, кітайскай, італьянскай, нямецкай філалогіі, корпуснай лінгвістыкі, кабінет аўдыявізуальных сродкаў навучання, кабінет-музей беларускага фальклору. Для арганізацыі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу створаны Вучэбны цэнтр інфармацыйных тэхналогій. На факультэце дзейнічае таксама Цэнтр філалагічнай падрыхтоўкі, дзе абітурыенты рыхтуюцца да ўступных экзаменаў.

На факультэце працуюць 25 дактароў навук і звыш 120 кандыдатаў навук.

Студэнты-філолагі атрымліваюць грунтоўныя веды па беларускай, рускай, сусветнай літаратурах, вывучаюць працэсы гістарычнага развіцця моў, даследуюць іх сучасны стан, а таксама спасцігаюць сакрэты асноў літаратурна-мастацкай дзейнасці, метадаў аўтаматычнай апрацоўкі тэкстаў, тэорыі і практыкі перакладу, камп'ютарных тэхналогій. Студэнты аддзяленняў славянскай, рамана-германскай, усходняй філалогіі праходзяць моўную практыку ў краінах вывучаемай мовы: Польшчы, Чэхіі, Германіі, Кітаі і інш.

Для студэнтаў і магістрантаў арганізавана больш за 50 навуковых спецсемінараў па актуальных праблемах сучаснага літаратуразнаўства і лінгвістыкі, а таксама метадыцы выкладання мовы і літаратуры. На факультэце функцыянуюць 3 камп'ютарныя класы і 3 міжфакультэцкія медыятэкі.

На вячэрніх курсах студэнты па жаданні вывучаюць дадаткова адну са славянскіх ці заходнееўрапейскіх моў (з атрыманнем адпаведнага пасведчання). Апрача таго, студэнты маюць магчымасць паралельнага навучання на любым факультэце БДУ для атрымання другой спецыяльнасці: юрыста, эканаміста, псіхолага і інш.



ДЫПЛОМ ФІЛОЛАГА ЗАПАТРАБАВАНЫ!

У наш час, калі актыўна развіваюцца разнастайныя формы міжнароднага супрацоўніцтва, выдатная моўная, агульнакультурная падрыхтоўка дазваляе выпускнікам філалагічнага факультэта БДУ паспяхова працаваць у якасці рэферэнтаў, маркетолагаў, перакладчыкаў у арганізацыях, установах, на прадпрыемствах народнай гаспадаркі любога профілю, у рэкламных агенцтвах і турыстычных фірмах. З укараненнем новых напрамкаў нашы спецыялісты сталі як ніколі запатрабаванымі ў выдавецтвах, у рэдакцыях газет, часопісаў, радыё і тэлебачання. Рознабаковая падрыхтоўка і высокая эрудыцыя дазваляюць ім упэўнена адчуваць сябе ў якасці аўтараў праграм, рэдактараў, а таксама вядучых самых рэйтынгавых перадач. Сёння філолагі паспяхова працуюць у цэнтрах інфармацыйных тэхналогій, у навуковых і навукова-вытворчых цэнтрах, якія займаюцца пытаннямі камп'ютарнай апрацоўкі тэксту і маўлення. Судовыя спрэчкі па абароне аўтарскіх правоў, па абароне годнасці грамадзян немагчымыя без правядзення рознага кшталту экспертыз тэксту, вусных выказванняў і нават асобных слоў, што, у сваю чаргу, абумовіла неабходнасць прысутнасці філолагаў і ў сістэме праваахоўных органаў. Глыбокая дасведчанасць нашых выпускнікоў у пытаннях сусветнай літаратуры і культуры, выдатная агульнагуманітарная падрыхтоўка забяспечваюць нашым выпускнікам працаўладкаванне ў літаратурных музеях, архівах, аддзелах рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэк, а таксама ў сістэме народнай адукацыі.



***Басалыга Лізавета***, *выпускніца 2016 года спецыяльнасці «Беларуская філалогія».*

*– У перыяд вучобы актыўна ўдзельнічала ў грамадскім і культурным жыцці факультэта, уваходзіла ў склад такіх арганізацый, як савет па якасці адукацыі, студэнцкі саюз, прэс-служба філфака. Свае творчыя здольнасці праявіла падчас працы над студэнцкай газетай факультэта «СЛОВА», галоўным рэдактарам якой была на 4 і 5 курсе.*

*З вуснаў амаль кожнага студэнта нашай alma mater можна пачуць, што БДУ – гэта вялікая сям'я. Але да трох вялікіх літар «БДУ» мне хацедася б дадаць яшчэ дзве літаркі – «ФФ» – філалагічны факультэт.*

*Філалагічны факультэт БДУ – тэрыторыя творчых асоб, дзе ў кожнага таленавітага студэнта ёсць магчымасць раскрыцца ва ўсёй паўнаце. Менавіта тут я змагла рэалізаваць шмат цікавых праектаў: фотавеламарафон, дабрачынны баль на філфаку, «БДУ ў тваім фармаце» і многія іншыя. Тут я атрымала магчымасць пазнаёміцца з вялікай колькасцю цікавых і вельмі адкрытых людзей, з якімі мне пашчасціла займацца адной справай і ў выніку кожную хвілінку свайго студэнцкага жыцця рабіць незабыўнай!*

*Дзякуй за ўсё БДУ! Разам мы адна сям'я! Разам – адна каманда!*

# ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

*Дэкан – кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Сяргей Уладзіміравіч МАЛЫ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 5. Тэл. 209-58-18, 209-58-17.*
*E-mail: maly@bsu.by; www.rfe.by*

Радыёфізікаў у БДУ рыхтуюць з 1962 г. У 1976 г. адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі. У 2010 г. ён перайменаваны ў факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.

Навучальны працэс забяспечваюць больш за 90 выкладчыкаў, у тым ліку 1 акадэмік і 2 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 15 прафесараў, 63 дацэнты, 49 інжынераў і лабарантаў.

У структуры: 8 кафедраў, 4 навукова-даследчыя лабараторыі, 3 СНДЛ, даследча-тэхналагічны цэнтр «Нанатэхналогіі і фізічная электроніка», цэнтр аэракасмічнай адукацыі, сучасныя камп'ютарныя класы, медыятэка.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасцях: **«Радыёфізіка», «Фізічная электроніка», «Камп'ютарная бяспека», «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «Прыкладная інфарматыка»** з наступнымі спецыялізацыямі: статыстычная радыёфізіка, мультымедыйныя інфармацыйныя тэхналогіі, квантавая радыёфізіка і лазерныя сістэмы, стахастычныя працэсы і сістэмы, мікра- і нанасістэмы, камп'ютарнае прыборабудаванне, інтэлектуальныя інфармацыйныя тэхналогіі, прыкладная электрадынаміка, цвёрдацельная электроніка, нанаэлектроніка і нанатэхналогіі, квантавая электроніка, фізічная мікраэлектроніка, медыцынская электроніка, тэлекамунікацыйныя і інфармацыйныя сістэмы, інфармацыйна-аналітычныя метады ў электроніцы, радыёэлектронныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, комплекснае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі тэлекамунікацыйных і інфармацыйных сістэм, праграмна-тэхнічныя сродкі і сістэмы абароны інфармацыі, інтэлектуальныя тэхналогіі абароны інфармацыйных сістэм, мадэляванне і аналіз інфармацыйных сістэм, глабальныя навігацыйныя і тэлекамунікацыйныя сістэмы, радыёэлектронныя сістэмы апрацоўкі і перадачы інфармацыі, бартавыя і наземныя інфармацыйныя комплексы.



Нашы выпускнікі працуюць у сферах IT, тэлекамунікацый, радыёэлектроннага і аптычнага прыборабудавання, камп'ютарных сетак, праграмаванай электронікі, мікраэлектронікі, нанаэлектронікі, лазерных аптычных тэхналогій. Яны накіроўваюца ў навукова-даследчыя інстытуты, прыборабудаўнічыя, радыёэлектронныя, камп'ютарныя, тэлекамунікацыйныя арганізацыі, фірмы, кампаніі, камп'ютарныя дэпартаменты банкаў. Сярод іх ёсць кіраўнікі і вядучыя спецыялісты навукова-вытворчых аб'яднанняў, даследчых інстытутаў, ВНУ, а таксама буйныя бізнесмены.

***Мікалай Зянькевіч,*** *старшы выкладчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, галоўны інжынер-праграміст EPAM Systems.*

*– З фізікі вядома, што калі частата ўласных хістанняў супадае з частатой знешняга ўздзеяння, то ўзнікае рэзананс і ўздзеянне можа быць шматразова ўзмоцнена. Нешта падобнае, як мне здаецца, адбываецца і на нашым факультэце. Цікаўнасць і энергія студэнтаў узмацняецца энтузіязмам і вопытам выкладчыкаў – яны падладжваюцца, прыціраюцца адзін да аднаго, а затым пачынаюць працаваць на поўную моц. Такі сплаў дазваляе студэнтам атрымаць агульны фундаментальны базіс вышэйшай фізіка-тэхнічнай адукацыі, а таксама практычныя навыкі, запатрабаваныя як у Беларусі, так і за мяжой, а выкладчыкі змушаны працягваць самаадукацыю і развівацца разам са сваімі вучнямі.*



***Антон Саечнікаў,*** *аспірант ФРКТ.*



*– Высокі ўзровень адукацыі і вялізны навуковы патэнцыял выкладчыкаў ФРКТ дазваляе выпускнікам атрымліваць якасную адукацыю і станавіцца запатрабаванымі спецыялістамі і навукоўцамі. За апошні год я стаў удзельнікам 5 міжнародных канферэнцый і кангрэсаў па касмічных тэхналогіях. Курыраваў і кіраваў камандай навучэнцаў-студэнтаў БДУ, якая запусціла наноспадарожнік на стратасферным шары на вышыню 30 км з палігона пад горадам Дубна Маскоўскай вобласці і стала пераможцам V адкрытага чэмпіянату «CanSat у Расіі». Добразычлівая атмасфера, сяброўскае атачэнне, сучасная навукова-тэхнічная база факультэта дазваляе ўвасабляць у жыццё самыя смелыя праекты і ідэі.*

# ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Начальнік – палкоўнік Ігар Анатольевіч НОВІКАЎ*
*Адрас: г. Мінск вул. Кастрычніцкая, 4.*
*Тэл. 209-56-02. Тэл./факс 209-56-25.*

Факультэт пачынаўся з ваеннай кафедры БДУ, утворанай 4 лістапада 1926 г. За перыяд да 2003 г. ваенная кафедра падрыхтавала тысячы афіцэраў запасу па 13 ваенна-ўліковых спецыяльнасцях.

У 2003 г. кафедра была рэарганізавана ў ваенны факультэт БДУ.

Падрыхтоўка студэнтаў вядзецца па 9 спецыяльнасцях па праграмах афіцэраў запасу, па 15 праграмах малодшых вайсковых спецыялістаў.

Падчас навучання курсанты і студэнты выконваюць практыкаванні стральбы са стралковай зброі, сродкаў узбраення БМП, а таксама практыкаванні па кіраванні баявой тэхнікай.

Падрыхтоўка курсантаў на ваенным факультэце вядзецца па 5 спецыяльнасцях: «Хімія» (напрамак – радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона), «Правазнаўства» (спецыялізацыя – «Юрысконсульцкая работа ў ваеннай сферы»), «Геаінфармацыйныя сістэмы» (напрамак – спецыяльныя), «Прыкладная крыптаграфія»; «Міжнародныя адносіны» (спецыялізацыя – «Міжнародныя адносіны ў ваеннай сферы»).

**Хімія:** пасля заканчэння навучання надаецца кваліфікацыя *«Спецыяліст па кіраванні. Хімік-эколаг»*.

**Правазнаўства:** выпускніку надаецца кваліфікацыя *«Юрыст»*. Яго рыхтуюць да арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-даследчай, экспертна-аналітычнай дзейнасці.

**Геаінфармацыйныя сістэмы:** выпускнік атрымлівае кваліфікацыю *«Спецыяліст па геаінфармацыйных сістэмах»*.

**Прыкладная крыптаграфія:** выпускнік атрымлівае кваліфікацыю – *«Матэматык. Спецыяліст па абароне інфармацыі»*.

**Міжнародныя адносіны:** выпускнік атрымлівае кваліфікацыю – *«Спецыяліст па міжнародных адносінах. Перакладчык-рэферэнт (з указаннем моў зносін)»*.



На ўсіх спецыяльнасцях факультэта вывучаюцца агульнапрафесійныя дысцыпліны адпаведных грамадзянскіх спецыяльнасцяў, а таксама: ваенная тапаграфія, ваенна-інжынерная падрыхтоўка, агульная тактыка, агульнавоінскія статуты, агнявая падрыхтоўка, асновы ваеннага заканадаўства, радыяцыйная, хімічная і біялагічная абарона, страявая падрыхтоўка, кіраванне і сродкі сувязі.

Форма атрымання адукацыі на факультэце – дзённая.

На ваенны факультэт маюць права паступаць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь:

– ва ўзросце ад 17 да 21 года, у тым ліку тыя, якія дасягнулі 17-гадовага ўзросту або 21-гадовага ўзросту ў год паступлення на вучобу;

– якія прайшлі або праходзяць тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, прайшлі ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 23 гады;

– вайскоўцы, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, – не старэйшыя за 25 гадоў;

– на ўсе спецыяльнасці навучання прымаюцца толькі асобы мужчынскага полу.

Абітурыенты ва ўзросце да 18 гадоў, акрамя дакументаў, неабходных для паступлення ў БДУ, дадаткова ў абавязковым парадку прадстаўляюць пісьмовую згоду аднаго з бацькоў альбо законнага прадстаўніка.

Тэрмін навучання па спецыяльнасцях: «Хімія», «Правазнаўства», «Геаінфармацыйныя сістэмы», «Міжнародныя адносіны» – 4 гады; «Прыкладная крыптаграфія» – 5 гадоў.

Курсанты пражываюць у інтэрнаце. Два разы ў год (узімку і ўлетку) курсантам даецца канікулярны адпачынак працяглацю 14 і 30 сутак адпаведна.

***Арцём Навакоўскі,*** *прызёр чэмпіянату свету па гіравым спорту, майстар спорту.*



*– На ваенным факультэце створаны ўсе неабходныя ўмовы для заняткаў спортам, уключаючы матэрыяльную базу і кваліфікаваных трэнераў. Вялікую падтрымку ажыццяўляе камандаванне факультэта, даючы час для заняткаў улюбёным спортам, што не замінае якаснай падрыхтоўцы да навучальнага працэсу.*

***Цюрын Яўген,*** *старшыня студэнцкага савета інтэрната № 7 студэнцкага гарадка БДУ 2015/2016 гг., кандыдат на званне «Студэнт года БДУ–2017».*

*– За перыяд навучання на ваенным факультэце мне ўдалося рэалізаваць мноства ідэй і арганізаваць некалькі маштабных мерапрыемстваў не толькі для курсантаў, але і для ўсіх студэнтаў нашага ўніверсітэта.*

*Для мяне ваенны факультэт БДУ стаў сапраўднай платформай для рэалізацыі сваіх ідэй, якія я з радасцю ажыццявіў на карысць роднага факультэта. А магчымасць атрымання якаснай адукацыі ў вядучай ВНУ краіны дазволіць у далейшым прынесці немалую карысць у высакароднай справе служэння Айчыне.*



# ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

*Дырэктар – кандыдат філалагічных навук дацэнт Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК*
*Адрас: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9.*
*Тэл. 259-74-00.*
*E-mail: jour@bsu.by; www.journ.bsu.by*

Факультэт журналістыкі БДУ быў заснаваны ў 1944 г. З 1 верасня 2008 г. рэарганізаваны ў Інстытут журналістыкі з двума факультэтамі – факультэтам журналістыкі і факультэтам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі забяспечваюць 10 кафедраў. У інстытуце ёсць лабараторыі аўдыявізуальных тэхналогій, інфарматыкі і мультымедыя (3 камп'ютарныя класы), фотажурналістыкі, а таксама вучэбна-выдавецкая лабараторыя. Заняткі таксама праходзяць у сучасным Тэлевізійным цэнтры БДУ. На кафедрах працуюць студэнцкія навуковыя гурткі, лабараторыі («Крытык», «Медыяпсіхолаг»), клубы, літаратурная аб'яднанні. Рэгулярна праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, конкурсы творчых работ, заняткі ў «Акадэміі PR» і «Школе маладога журналіста».

Студэнты з дапамогай выкладчыкаў выпускаюць газеты «ЖурФАКТЫ», «Перья», часопіс «Завтрак на траве», ствараюць канал «Журфак ТБ», інфармацыйныя рэсурсы «Вэб-журналіст» і Studlive.by.

Факультэт забяспечвае падрыхтоўку па наступных спецыяльнасцях:

**«Журналістыка»** (кваліфікацыя *«Журналіст»*)

Напрамкі: журналістыка (друкаваныя СМІ), журналістыка (аўдыявізуальная), журналістыка (вэб-журналістыка), журналістыка (менеджмент сродкаў масавай інфармацыі).

Пасады, якія могуць займаць выпускнікі: рэдактар, выпускаючы адказны, аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, каментатар, карэспандэнт, карэспандэнт спецыяльны, вядучы праграмы, рэдактар інтэрнэт-рэсурса.

**«Журналістыка міжнародная»** (кваліфікацыя *«Журналіст-міжнароднік»*)

Пасады: аглядальнік палітычны, аглядальнік па эканамічных пытаннях, карэспандэнт уласны, аглядальнік, замежны карэспандэнт.

**«Інфармацыя і камунікацыя»** (кваліфікацыя *«Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі»*)

Пасады: спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, спецыяліст па рэкламнай камунікацыі, прэс-сакратар, рэдактар інтэрнэт-рэсурса.

**«Літаратурная работа»**

Напрамкі: літаратурная работа (рэдагаванне) (кваліфікацыя *«Літаратурны рэдактар. Журналіст»*), літаратурная работа (творчасць) (кваліфікацыя *«Літаратурны работнік. Журналіст»*).

Пасады: рэдактар, рэдактар-стыліст, рэдактар-перакладчык, літаратурны супрацоўнік, рэдактар-кансультант, карэспандэнт.

Шчыра запрашаем!











***Вераніка Канюта,** выпускніца Інстытута журналістыкі БДУ (2014), магістратуры БДУ (2015); спецыяльны карэспандэнт РВУ «Выдавецкі дом «Звязда»; лаўрэат творчых конкурсаў Міністэрства абароны і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, моладзевага творчага конкурсу «Дэбют» Беларускага саюза журналістаў у намінацыі «Найлепшы рэпарцёр» (2015):*

*– Паступіць на журфак было найвялікшай марай. І вось я, дзяўчынка з вёскі, – студэнтка галоўнай ВНУ краіны, аднаго з прэстыжных і, бадай, самага цікавага ўніверсітэцкага факультэта. Журфакаўскія сцены, якія здаваліся недасягальнымі, сталі такімі ўтульнымі і роднымі, што і дагэтуль адчуваеш сябе тут «сваім». І не былі б яны такімі блізкімі, каб не выкладчыкі – галоўны кавалі журналісцкіх кадраў краіны, і не студэнты-аднакурснікі, якія па крэатыўнасці, яскравасці таленту і ўніверсальнасці не маюць сабе роўных. Для многіх з іх, як і для мяне, журфак стаў уваходным білетам у прафесію. Прафесію, якую, аднойчы паспытаўшы, не разлюбіш ніколі!*

# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

*Дэкан – доктар гістарычных навук прафесар Аляксандр Генадзьевіч КАХАНОЎСКІ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6. Тэл. 209-55-98, факс 327-30-14.*
*E-mail: hist@bsu.by; www.hist.bsu.by*

Гістарычны факультэт БДУ – найстарэйшая і найбольш аўтарытэтная навучальная і навуковая ўстанова гістарычнага профілю ў краіне.

На будынку факультэта ўсталяваны мемарыяльная дошка ў гонар першага рэктара БДУ і ахоўная дошка, якая сведчыць, што тут у 1921 г. адбылося адкрыццё ўніверсітэта. З тых часоў бяруць пачатак навуковыя гістарычныя школы на факультэце, шырока вядомыя ў краіне і па-за яе межамі. Больш за 10 тыс. нашых выпускнікоў працуюць у сістэме навукі і адукацыі, масмедыя, музеях, турыстычных фірмах, банкаўскіх установах, удзельнічаюць у палітычным жыцці краіны, яе адміністрацыйным кіраванні.

На факультэце працуюць 2 акадэмікі, 1 член-карэспандэнт НАН Беларусі, больш за 20 прафесараў і 90 дацэнтаў. Дзейнічаюць 9 кафедраў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па чатырох спецыяльнасцях:

1. **«Гісторыя (па напрамках)»,** напрамкі: айчынная і ўсеагульная гісторыя, паліталогія, археалогія, этналогія, гісторыя мастацтваў, гісторыя рэлігій, гістарычная інфарматыка, гісторыя міжнародных зносін;

2. **«Гісторыка-архівазнаўства»;**

3. **«Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)»,** напрамкі: гісторыя і музеалогія, мастацтвазнаўства і музеалогія, культурная спадчына і турызм;

4. **«Дакументазнаўства (па напрамках)»,** напрамкі: дакументацыйнае забеспячэнне кіравання, інфармацыйнае забеспячэнне кіравання.

Выпускнікі спецыяльнасці «Гісторыя (па напрамках)» уладкоўваюцца ў школы і гімназіі, а таксама ва ўстановы вышэйшай адукацыі і навукі, дзяржаўныя ўстановы, масмедыя і г. д. Новыя напрамкі – паліталогія, археалогія, гісторыя рэлігій, гістарычная інфарматыка, гісторыя міжнародных зносін – робяць вывучэнне гістарычных праблем больш разнастайным і набываюць усё большую папулярнасць сярод абітурыентаў.

Музеязнаўцы падчас навучання праходзяць практыку ў слаўтых музеях краіны, ва ўстановах адукацыі, турыстычных фірмах. Зараз факультэт актыўна развівае напрамак «Культурная спадчына і турызм», каб забяспечыць патрэбы дзяржавы ў высокапрафесійных спецыялістах у галіне рэгіянальнага турызму.

Архівісты і дакументазнаўцы рыхтуюцца пры ўдзеле Дэпартамента Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, у распараджэнне якога пераважна і размяркоўваюцца. Акрамя таго, дакументазнаўцы працуюць у банкаўскіх установах, кадравых службах, службах ДЗК.

На спецыяльнасці «Дакументазнаўства (па напрамках)» студэнтам выкладаецца шырокае кола прававых дысцыплін, для чаго прыцягваюцца выкладчыкі юрыдычнага факультэта БДУ і юрысты-практыкі.



Ва ўмовах сучаснай універсітэцкай адукацыі традыцыі факультэта спалучаюцца з выкарыстаннем навацый. Створаны і паспяхова працуюць навуковыя школы. База для вучэбнай і навуковай работы адпавядае сучасным патрабаванням, скіравана на шырокае выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій.

Актывізацыі навучальнага працэсу спрыяе музей археалогіі, этнаграфіі і антычнага мастацтва. Яго нумізматычная калекцыя – адна з самых багатых і каштоўных у краіне.

***Вячаслаў Качанаў** – выпускнік 1985 г. па спецыяльнасці «гісторыя». Працуе начальнікам упраўлення знешнепалітычнага аналізу Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя (2006-2013 гг.).*



*– Гістарычны факультэт БДУ дазволіў атрымаць сапраўды шырокія і разнастайныя веды, якія па вартасці ацэньваеш праз гады пасля расстання са сваёй альма-матар. Куды б ні закінуў лёс, ты як бы трапляеш у «да болю знаёмыя мясціны», гісторыю якіх апрыёры добра ведаеш, можаш многае зразумець і расказаць. А вялікім і асабліва каштоўным «бонусам» становіцца дэталёвае веданне мінулага сваёй уласнай краіны, якая ў супляценні разнастайных абставінаў цікавая і дзівосная для многіх як блізкіх, так і далёкіх куткоў свету. За што асабліва ўдзячны сваім выкладчыкам, сярод якіх былі сапраўды легендарныя асобы і сапраўдныя карыфеі, якія стварылі сучасную высакакласную гістарычную навуковую школу і вырасцілі вельмі годную змену. Рады бачыць у ёй нямала сваіх аднакурснікаў. І, мабыць, не выпадкова, што цэлая кагорта дыпламатаў, якія цяпер узначальваюць у тым ліку шэраг упраўленняў МЗС, прайшлі праз наш факультэт. У рэшце рэшт, менавіта гістфак стаў своеасаблівай «калыскай» факультэта міжнародных адносін, і, дарэчы, не толькі яго.*

***Яўген Сітко** – выпускнік 2014 г. па спецыяльнасці «гісторыя (паліталогія)». Працуе настаўнікам 1 катэгорыі у ДУА «Сярэдняя школа № 199 г. Мінска». У 2015 г. стаў пераможцам у гарадскіх конкурсах «Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі» у намінацыі «Мы – маладыя!», «Найлепшы малады спецыяліст–2015» у намінацыі «Найлепшы малады спецыяліст у сферы адукацыі» і конкурсе прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар–2015».*



*– Што мне даў гістарычны факультэт? БДУ ў цэлым і гістарычны факультэт у прыватнасці за 5 гадоў вучобы далі мне вельмі многае. Па-першае, я атрымаў фундаментальную гуманітарную адукацыю, якая дапамагае мне як у прафесійнай і грамадскай дзейнасці, так і ў звычайных зносінах кожны дзень. Па-другое, я змог навучыцца арганізоўваць канферэнцыі і турніры, працаваць з юрыдычнымі дакументамі, кіраваць паўсядзённай дзейнасцю студэнцкіх арганізацый. Усё гэта дазваляе мне ініцыяваць і развіваць розныя праекты ў грамадскай сферы, з'яўляючыся кампетэнтным спецыялістам у шырокім коле пытанняў.*

*Нарэшце, БДУ і гістарычны факультэт былі для мяне выдатнай «школай жыцця», якая навучыла мяне арганізоўваць сябе і сваю навучальную і пазавучэбную дзейнасць, будаваць камунікацыю з рознымі людзьмі, эфектыўна і плённа працаваць у калектыве людзей і многае іншае.*

*Я ніколі не шкадаваў, што паступіў на гістарычны факультэт БДУ, а, наадварот, ганаруся тым, што быў часткай першай ВНУ краіны!*

# ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

***Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Уладзімір Уладзіміравіч АПАНАСОВІЧ***
***Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 5. Тэл./факс 399-23-93. E-mail: sbmt@bsu.by; www.sbmt.bsu.by***

ІБМТ утвораны ў 1996 г. Інстытут рыхтуе спецыялістаў міжнароднага ўзроўню ў галіне бізнес-кіравання і кіравання новымі тэхналогіямі.

У 2004 г. інстытут упершыню ў Беларусі пачаў падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Бізнес-адміністраванне».** З 2009 г. адкрыта спецыяльнасць **«Лагістыка»,** а ў 2011 г. пачата падрыхтоўка па спецыяльнасці **«Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі».** Дадзеныя спецыяльнасці прапануюць атрыманне першай і другой вышэйшай адукацыі на дзённай і завочнай формах.

**«Бізнес-адміністраванне», «Лагістыка», «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі»** сёння з'яўляюцца найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі ў сферы эканомікі ва ўмовах пераходу да нацыянальнай інавацыйнай сістэмы. Спецыяльнасці прадугледжваюць сфарміраванасць светапогляду і аваладанне выпускніком кампетэнцыямі, якія грунтуюцца на глыбокім разуменні рынкавай эканомікі, функцый і эканамічнай ролі дзяржавы, усведамленні сацыяльнай адказнасці бізнесу. Праграмы падрыхтоўкі разлічаны на тых, хто планує прэтэндаваць на кіраўніцкія пасады ў бізнесе.

Вялікая ўвага ў інстытуце надаецца вывучэнню англійскай мовы, якая з'яўляецца не толькі праграмнай дысцыплінай, але і мовай выкладання асобных курсаў. Большасць выкладчыкаў прайшла спецыяльную падрыхтоўку ці стажыроўку за мяжой у рамках сумесных міжнародных адукацыйных праектаў.

З 2014 г. інстытут пачаў падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» на англійскай мове. У студэнтаў спецыяльнасці «Лагістыка» з'явілася магчымасць атрымаць двайны беларуска-фінскі дыплом спецыяліста па лагістыцы. Студэнты ўсіх спецыяльнасцяў маюць магчымасць праходзіць вытворчую практыку на прадпрыемствах Польшчы, Італіі і Латвіі.

З 1996 г. у ІБМТ рэалізуецца магістарская праграма па падрыхтоўцы бізнес-спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. У 2003 г. выпускнікі гэтай праграмы ўпершыню ў Беларусі атрымалі дзяржаўны дыплом магістра па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» (праграма MBA). Паводле ацэнкі міжнароднай экзаменацыйнай камісіі, узровень ведаў нашых выпускнікоў праграмы MBA ІБМТ БДУ адпавядае стандартам якасці заходніх універсітэтаў.

У 2012 г. інстытут адкрыў падрыхтоўку магістраў па спецыяльнасцях практыка-арыентаванай магістратуры «Кіраванне лагістычнымі сістэмамі» і «Інавацыйны менеджмент», у 2013 – «Тэхналогіі кіравання персаналам», у 2015 – «Фінансавы менеджмент». З 2016 года адкрыта падрыхтоўка па спецыяльнасці«Кіраванне банкаўскім бізнесам».

Адна з асноўных асаблівасцяў інстытута – паслядоўнае далучэнне да міжнароднай адукацыйнай прасторы. ІБМТ мае партнёрскія зносіны з многімі заходнімі ўніверсітэтамі, актыўна ўдзельнічае ў разнастайных міжнародных праектах. Найлепшыя студэнты маюць магчымасць стажыравацца ў Стакгольмскай школе эканомікі ў Рызе (Латвія), Універсітэце менеджменту і эканомікі (Літва), праходзіць практыку ў буйных замежных кампаніях і інш.

Актыўна развіваецца сістэма дыстанцыйнага навучання, укараняюцца інавацыйныя тэхналогіі ў навучальны працэс – над гэтай задачай плённа працуе асобная структура інстытута – Цэнтр дыстанцыйнай адукацыі і інфармацыйных тэхналогій.

Інстытут надае вялікую ўвагу працаўладкаванню і планаванню будучай кар'еры студэнтаў. Створаны тут Цэнтр развіцця кар'еры праводзіць цэлы комплекс мерапрыемстваў у гэтым кірунку: пошук месцаў вытворчай і пераддыпломнай практыкі, сустрэчы з прадстаўнікамі кампаній і паспяховымі выпускнікамі, трэнінгі па будаванні кар'еры і дапамога ў працаўладкаванні.

Запрашаем стаць студэнтамі Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ!

***Кірыл Катушкін,*** *аўдытар замежнага аўдытарскага прадпрыемства «Дэлойт і Туш» (Deloitte and Touch). Выпускнік 2012 г.*



*– Я лічу, што Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ – найлепшая бізнес-школа нашай краіны. Асабіста мне падабаецца, што ў інстытуце вялікая ўвага надаецца самастойнай працы студэнтаў з навучальным матэрыялам, асноўны ўпор робіцца на практычныя заняткі, а выкладчыкі шмат у чым могуць прадвызначыць поспех кожнага студэнта ў яго будучай кар'еры. Інстытут шырока ўкараняе прагрэсіўныя тэхналогіі ў навучальны працэс, таму ў яго выпускнікоў больш шансаў на рынку працы знайсці цікавую і запатрабаваную грамадствам працу. Падчас вучобы я ўдзельнічаў у праграме студэнцкага абмену і вучыўся ў ЗША, дзе захапіўся вывучэннем міжнароднага бізнесу і кіраваннем чалавечымі рэсурсамі.*

***Алена Ярмак,*** *лагістык кампаніі «Kuhene+ Nagel». Выпускніца 2014 г.*



*– Падчас вучобы ў ІБМТ я паспела папрацаваць у беларускай лагістычнай кампаніі і прайсці стажыроўку ў польскай (міжнародная лагістычная кампанія «Kuhene+Nagel»). Безумоўна, іх складана параўноўваць, таму што гэта розныя кампаніі па сваіх маштабах, абаротах і бачанні бізнесу. Праца ў польскай кампаніі ўяўляла сабой знаёмства з прафесіяй і выкананне абавязкаў лагістыка. Практыка стала добрым штуршком да павышэння ўзроўню прафесійнага развіцця. Пасля ўніверсітэта мне прапанавалі супрацоўнічаць з кампаніяй ужо ў якасці паўнапраўнага спецыяліста. Дзякуй ІБМТ БДУ за веды і магчымасці!*

***Паліна Драніцына,*** *інжынер аддзела мабільных распрацовак «ЭПАМ Сістэмз». Выпускніца 2016 года спецыяльнасці «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі».*



*За 4 гады, што я атрымлівала вышэйшую адукацыю, знайшла не толькі найлепшых сяброў і выдатных калег, але яшчэ і працу сваёй мары – гэта шмат у чым заслуга Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій.*

*Зараз працую ў EPAM інжынерам па тэсціраванні. Праца дужа цікавая, і ўсе навыкі, якія я атрымала ў інстытуце, так ці інакш мне спатрэбіліся. Дагэтуль, падчас вучобы, я працавала графічным дызайнерам – таксама дзякуючы сваёй альма-матар.*

# ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

***Дырэктар – доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН***
***Адрас: г. Мінск, вул. Шпалерная, 7. Тэл. 306-00-20. Факс 306-00-40.***
***E-mail: mail@e-edu.by; www.e-edu.by, www.simst.bsu.by***

Дзейсныя эканамічныя пераўтварэнні немагчымыя без кваліфікаваных спецыялістаў, якія б мелі фундаментальныя веды ў галіне эканомікі, кіравання, права, сацыяльных навук, валодалі б сучаснымі тэхналогіямі, маглі б без цяжкасцяў працаваць на сусветным узроўні. Аснова эфектыўнасці навучання ў інстытуце – якасць і ўзровень выкладання, навізна навучальных праграм, склад выкладчыцкіх кадраў.

Спецыяльнасць: **Менеджмент.**

Напрамкі спецыяльнасці: менеджмент (сацыяльна-адміністратыўны), спецыялізацыя: кіраванне персаналам; менеджмент (фінансавы і інвестыцыйны), спецыялізацыя: фінансавы менеджмент; менеджмент (нерухомай маёмасці); кваліфікацыя: *«Менеджар-эканаміст».*

Гэтая спецыяльнасць дазваляе атрымаць адну з найбольш цікавых прафесій – менеджар-эканаміст. Па ёй рыхтуюцца спецыялісты шырокага профілю з рознабаковай эканамічнай і праваой падрыхтоўкай. Студэнты набываюць навыкі аналізу механізма кіравання прадпрыемствам, авалодваюць тэхналогіяй і метадамі працы з людзьмі.

Спецыяльнасць: **Маркетынг.**

Спецыялізацыі: маркетынг у электроннай камерцыі; міжнародны маркетынг; рэкламная дзейнасць; кваліфікацыя: *«Маркетолаг-эканаміст».*

Спецыялізацыя дазволіць студэнтам арыентавацца не толькі ў традыцыйных, але і ў перспектыўных інструментах маркетынгу – інфармацыйных тэхналогіях. Выпускнікі змогуць працаваць як у сферы традыцыйнага маркетынгу, так і спецыялістамі ў галіне электроннай камерцыі, а таксама інтэрнэт-маркетолагамі.

Спецыяльнасць: **Сацыяльная работа.**

Напрамкі спецыяльнасці: сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць, сацыяльна-рэабілітацыйная дзейнасць. Кваліфікацыі: *«Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-псіхолаг», «Спецыяліст па сацыяльнай рабоце-рэабілітолаг».*

Студэнты атрымліваюць грунтоўныя веды па псіхалогіі, сацыяльнай рэабілітацыі, сацыяльнай медыцыне, тэорыі, метадах і тэхналогіях сацыяльнай работы, сацыяльна-эканамічнай палітыцы, менеджменце і іншых дысцыплінах. Выпускнікі маюць магчымасць працаваць не толькі ў дзяржаўных структурах (сацабарона і сацабслугоўванне, ахова здароўя, адукацыя, розныя галіны вытворчасці), але і ў грамадскіх арганізацыях (міжнародныя і рэспубліканскія фонды, асацыяцыі, таварыствы), самастойна развіваць бізнес у сферы сацыяльных паслуг.

Спецыяльнасць: **Дызайн.**

Напрамкі спецыяльнасці: дызайн (прадметна-прасторавага асяроддзя); кваліфікацыя: *«Дызайнер».*

Адметнасцю ў падрыхтоўцы спецыялістаў з'яўляецца спалучэнне прафесійнага трэнінгу ў галіне праектавання, кампазіцыі, жывапісу і малюнка, пластыкі, формаўтварэння з выкарыстаннем найноўшых інфармацыйных і матэматычных тэхналогій мадэлявання асяроддзя, з культурнымі, экалагічнымі фактарамі прафесіі. ДІКСТ забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў па тэорыі і гісторыі мастацтваў і дызайну, сучасных стратэгіях формаўтварэння і праектавання, камп'ютарных тэхналогіях, замежных мовах.



***Вікторыя Садоўская*** *– інтэрнэт-маркетолаг ТАА «Фірма «Севзапметалл» (РФ) – магістрантка НДУ ВШЭ. Выпускніца ДІКСТ БДУ 2016 г.*



*Кафедра маркетынгу і ўвогуле ДІКСТ навучылі мяне думаць нестандартна, хутка прымаць рашэнні, лавіць асноўную сутнасць задач, навучылі арганізоўваць каманду і накіроўваць яе на правільны шлях. Я вельмі ўдзячна кожнаму настаўніку, які быў на маім шляху ў ДІКСТ, і ганаруся тым, што была і застаюся часткай вялікай сям'і ДІКСТ!*

***Анжэла Зарэмба*** *– малодшы навуковы супрацоўнік РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі. Выпускніца 2016 года.*



*Веды і навыкі, атрыманыя ў працэсе навучання, дазваляюць ставіць перад сабой складаныя прафесійныя задачы і эфектыўна іх вырашаць. Я магу з упэўненасцю сказаць, што навучанне на «сацыяльнай рабоце» ў ДІКСТ не толькі дае розныя магчымасці для прафесійна-асобаснага росту, але і матывуе да яго!*

# ІНСТЫТУТ ТЭАЛОГІІ ІМЯ СВЯТЫХ МЯФОДЗІЯ І КІРЫЛА БДУ

*Рэктар – Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ,*
*Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, кандыдат багаслоўя*
*Адрас: г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 24.*
*Тэл. 327-63-67, 289-11-61. Тэл./факс 289-11-61.*
*E-mail: theology.bsu@tut.by; www. theology.bsu.by*

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ ажыццяўляе падрыхтоўку па спецыяльнасці **«Тэалогія»** з прысваеннем кваліфікацыі *«Тэолаг-рэлігіявед. Выкладчык грамадазнаўчых дысцыплін».* Нашы выпускнікі маюць магчымасць альбо працягваць навучанне ў магістратуры і аспірантуры, альбо працаваць выкладчыкамі курса «Рэлігіязнаўства» і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Высокі ўзровень падрыхтоўкі дазваляе ім таксама паспяхова працаваць у сферы навукі, культуры, царкоўнага і сацыяльнага служэння.



У структуры інстытута тры кафедры: багаслоўя, біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння, рэлігіязнаўства. Дзейнічае вучэбная літургічная лабараторыя. Больш за 65 % выкладчыкаў інстытута маюць навуковыя ступені і званні.

Студэнты вывучаюць 5 замежных моў: чатыры старажытныя (старажытнаяўрэйскую, старажытнагрэчаскую, лацінскую, царкоўнаславянскую) і адну сучасную (англійскую, французскую ці нямецкую).

У цыкле спецыяльных дысцыплін вывучаюцца Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запаветаў, біблейская археалогія, багаслоўе (асноўнае, параўнальнае, дагматычнае, маральнае), літургіка, патралогія, агульная гісторыя хрысціянскай царквы, кананічнае права, гістарычнае рэлігіязнаўства, сектазнаўства, сістэматычнае рэлігіязнаўства, рэлігійная філасофія, візанталогія, псіхалогія рэлігіі, сацыялогія рэлігіі.

У бібліятэцы інстытута назапашаны ўнікальны фонд навуковай літаратуры па багаслоўскіх, царкоўна-гістарычных, рэлігіязнаўчых і рэлігійна-філасофскіх дысцыплінах. Бібліятэчны фонд і фонд электронных рэсурсаў уключае больш за 21 000 назваў (27 000 адзінак захавання).



***Антон Блашко,*** *студэнт 5 курса, член савета інстытута, пераможца конкурса «Студэнт БДУ–2015» у намінацыі «Лідар».*

*– Вялікая перавага нашага інстытута заключаецца ў тым, што ён аб'ядноўвае ініцыятыўную хрысціянскую моладзь з усёй краіны. І, нягледзячы на тое, што навучэнцы прыходзяць сюды з рознымі інтарэсамі і чаканнямі, гэтая супольнасць дазваляе сумесна здзяйсняць самыя разнастайныя ідэі і праекты. Вывучэнне багаслоўя і грамадскае студэнцкае жыццё дапамагаюць нам убачыць шматлікія падзеі з розных бакоў. І гэта прымушае думаць, аналізаваць і імкнуцца змяняцца ў лепшы бок.*



***Крысціна Дагодзька,*** *выпускніца 2014 года, лаўрэат стыпендыі імя Ефрасінні Полацкай, старшыня савета старастаў Інстытута тэалогіі, у 2012–2013 гг. паралельна навучалася ва Універсітэце Арыстоцеля ў г. Салонікі (Грэцыя), за выдатную вучобу і актыўную навуковую дзейнасць была занесена на Дошку гонару БДУ.*

*Месца працы: Віцебская духоўная семінарыя.*

*– Тэалогія стаіць ля вытокаў усёй нашай адукацыі. Менавіта Царква ўпершыню прапанавала жыхарам Старажытнай Русі дакрануцца да ведаў пасродкам чытання Евангелля і Псалтыра, якія сталі першымі падручнікамі на нашых землях. Багаслоўская адукацыя сёння з'яўляецца комплексам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Інстытут тэалогіі прапануе авалодаць ведамі ў сферах багаслоўя, біблеістыкі і рэлігіязнаўства, а таксама ўключае ў свой вучэбны план шмат прадметаў з гістарычнай, філасофскай, педагагічнай і сацыялагічнай сфер. Такім чынам, выпускнікі Інстытута тэалогіі – гэта шматбакова адукаваныя спецыялісты, здольныя служыць сучаснаму грамадству і кожнаму чалавеку.*

*Гэта, без сумнення, унікальная навучальная ўстанова валодае ўсімі якасцямі для таго, каб стаць alma mater для выдатных спецыялістаў, якія сумяшчаюць прафесіяналізм і актыўную жыццёвую пазіцыю.*

ФАКУЛЬТЕТ ДОУНИВЕРСИТЕТСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

# ФАКУЛЬТЭТ ДАЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ АДУКАЦЫІ

*Дэкан факультэта – Вячаслаў Міхайлавіч МАЛАФЕЕЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Акадэмічная, 25. Тэл. 284-00-02, 284-26-82.*
*E-mail: fpuedu@bsu.by; www.fpuedu.bsu.by*

Колькасць выкладчыкаў – 50, у тым ліку 5 дацэнтаў. Для арганізацыі вучэбнага працэсу на падрыхтоўчых курсах прыцягваюцца звыш 60 вопытных выкладчыкаў з базавых кафедраў БДУ, ліцэяў і гімназій г. Мінска.

Факультэт мае тры камп'ютарныя класы, лінгафонны кабінет і бібліятэку з фондам літаратуры для абітурыентаў больш за 20 тысяч тамоў.

**Падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян** працуе ў БДУ з 1969 г.

Вучэбны працэс забяспечвае кафедра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. Асноўная мэта – падрыхтоўка слухачоў да цэнтралізаванага тэсціравання і паспяховай здачы ўступных экзаменаў на ўсе спецыяльнасці БДУ і на адпаведныя спецыяльнасці іншых ВНУ. На факультэце вядзецца падрыхтоўка па наступных профілях навучання: інжынерна-тэхнічны, фізічны, матэматычны, хімічны, геаграфічны, біялагічны, гістарычны, правазнаўства, эканамічны, мовазнаўства, літаратуразнаўства, філасофскі, сацыялагічны, культуралагічны, замежныя мовы, журналістыка, псіхалогія, сацыяльная абарона, міжнародныя адносіны, культура і мастацтва.

Тэрмін навучання на падрыхтоўчым аддзяленні складае 9 месяцаў з тыднёвай нагрузкай 18–26 акадэмічных гадзін. Форма навучання – дзённая.

У адпаведнасці з правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, вучэбны план кожнага профілю ўключае тры дысцыпліны: рускую або беларускую мову і два профільныя прадметы. Агульны аб'ём вучэбнага плана складае 612 акадэмічных гадзін.

Вучэбныя праграмы ўсіх дысцыплін складзены з улікам паглыблення, сістэматызацыі і абагульнення ведаў, атрыманых вучнямі ў сярэдняй школе. Навучальны год складаецца з двух семестраў, якія завяршаюцца экзаменацыйнымі сесіямі, заняткі праводзяцца ў форме практычных і семінарскіх заняткаў, шырока выкарыстоўваюцца розныя формы кантролю самастойнай работы. Такім чынам, слухачы атрымліваюць магчымасць адаптавацца да ўніверсітэцкай сістэмы адукацыі.

Пра эфектыўнасць працы падрыхтоўчага аддзялення сведчаць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, паказаныя нашымі выпускнікамі 2015 і 2016 гг.: па кожным прадмеце вынікі палепшаны на 10–20 балаў. Больш за 75 % выпускнікоў паступілі ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне патрэбны наступныя дакументы: заява на імя рэктара, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), сертыфікаты ЦТ, 6 фотаздымкаў 3х4, медыцынская даведка формы № 086-У. Калі ў абітурыента няма сертыфіката ЦТ па профільным прадмеце, то праводзіцца ўступны экзамен у форме тэсціравання.

Навучанне на аддзяленні платнае. Іншагароднім даецца інтэрнат.

Тэл.: 284-00-09, 284-00-83, 284-26-82.

**Падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян** вядзе сваю гісторыю з 1961 г.

За гэты час тут навучалася звыш 9 тыс. слухачоў больш чым са 120 краін. Вучэбны працэс на аддзяленні забяспечвае кафедра рускай мовы як замежнай і агульнаадукацыйных дысцыплін. У структуры вучэбнага плана ў аб'ёме 1216 акадэмічных гадзін: руская мова (840 гадзін) і два профільныя прадметы і факультатыў (376 гадзін).

Форма навучання – дзённая, навучанне платнае. Па выніках станоўча здадзеных экзаменаў за падрыхтоўчы курс замежныя грамадзяне атрымліваюць пасведчанне, якое дае ім права быць залічанымі для навучання па выбранай спецыяльнасці як у БДУ, так і ў іншыя ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Пры падрыхтоўчым аддзяленні працуюць таксама курсы рускай мовы, на якіх даецца магчымасць вывучаць рускую мову па розных праграмах з аб'ёмам ад 80 да 720 гадзін. У ліпені–жніўні дзейнічае летняя школа рускай мовы з рознымі праграмамі навучання працягласцю ад 4 да 8 тыдняў.

Для паступлення замежным грамадзянам трэба падаць наступныя дакументы: запрашэнне на навучанне, заяву на імя рэктара, пашпарт з візай, дакумент аб адукацыі, медыцынскую страхоўку і 6 фотаздымкаў.

Тэл.: 284-00-02, 284-00-01, 284-18-00.




**Падрыхтоўчыя курсы** для абітурыентаў розныя па формах (дзённыя, вячэрнія, завочныя (з аўдыторнымі заняткамі)) і тэрмінах навучання (ад 3 дзён да 8 месяцаў) дзейнічаюць на працягу ўсяго навучальнага года. Заняткі па ўсіх дысцыплінах праводзяцца як у групах камплектнасцю 10–12 слухачоў, так і ў групах малой камплектнасці (5–8 слухачоў), а таксама ў групах індывідуальнай падрыхтоўкі (1–2 слухачы). У залежнасці ад формы навучання і камплектнасці груп у тыдзень на прадмет адводзіцца 3, 4 або 6 акадэмічных гадзін. Навучанне вядуць высокакваліфікаваныя выкладчыкі ФДА, а таксама іншых факультэтаў БДУ і ўстаноў адукацыі горада Мінска, якія маюць вялікі вопыт работы ў галіне даўніверсітэцкай адукацыі. Пра эфектыўнасць падрыхтоўчых курсаў гаворыць той факт, што каля 90 % абітурыентаў, якія скончылі курсы і ўдзельнічалі ў конкурсе, становяцца студэнтамі БДУ, а астатнія – студэнтамі іншых універсітэтаў і каледжаў.

Таксама ФДА вядзе прыём вучняў 10-х класаў на курсы паглыбленага вывучэння агульнаадукацыйных дысцыплін.

Тэл. для даведак: 284-00-08, 284-00-18.

З мэтай эфектыўнай падрыхтоўкі абітурыентаў да цэнтралізаванага тэсціравання з 2004 г. сумесна з РІКВ праводзіцца **рэпетыцыйнае тэсціраванне.** Апрацоўка бланкаў адказаў і выдача вынікаў тэсціравання ажыццяўляецца па тэхналогіі цэнтралізаванага тэсціравання.

Тэл.: 284-00-18, 284-00-19.

***Алег Аляксеенкаў,*** *былы старшыня савета маладых вучоных БДУ, выпускнік 2004 г.*

*– Навучанне на ФДА – гэта трывалы мосцік паміж школай і гістарычным факультэтам БДУ. Я атрымаў глыбокія веды, змог самарэалізавацца, сустрэў сапраўдных сяброў, з якімі крочу па жыцці.*

# МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ

*Дырэктар – доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Сяргей Аляксандравіч МАСКЕВІЧ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23. Тэл. 398-99-79. Факс 398-99-53. E-mail: info@iseu.by; www.iseu.by*

Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ з'яўляецца базавай ВНУ экалагічнага профілю ў дзяржавах-удзельніцах СНД.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца на двух факультэтах па 7 спецыяльнасцях.

**ФАКУЛЬТЭТ МАНІТОРЫНГУ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ**

**Дэкан – кандыдат біялагічных навук дацэнт Уладзіслаў Уладзіміравіч ЖУРАЎКОЎ**

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23. Тэл. 299-51-35

Факультэт рыхтуе спецыялістаў, сфера дзейнасці якіх звязана з рашэннем пытанняў аховы навакольнага асяроддзя, выкарыстаннем і распрацоўкай экалагічных інфармацыйных сістэм, правядзеннем экалагічнага маніторынгу, прагназаваннем змен навакольнага асяроддзя пад уздзеяннем антрапагенных і прыродных фактараў, экалагічным аўдытам прадпрыемстваў, тэхнічным забеспячэннем працы ўстаноў аховы здароўя.

Выпускнікі факультэта працуюць ва ўстановах НАН Беларусі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у тым ліку ў РУП «Беларуская атамная электрастанцыя».

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях:

**«Прыродаахоўная дзейнасць»**, кваліфікацыя – *«Эколаг. Інжынер па ахове навакольнага асяроддзя»*.

Напрамак спецыяльнасці «Экалагічны менеджмент і экспертыза».

Напрамак спецыяльнасці «Экалагічны маніторынг».

**«Энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент»**, кваліфікацыя – *«Інжынер-энергаменеджар»*.

**«Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі»**.

Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у экалогіі)», кваліфікацыя – *«Інжынер-праграміст-эколаг»*.

Напрамак спецыяльнасці «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у ахове здароўя)», кваліфікацыя – *«Інжынер-праграміст»*.

**«Ядзерная і радыяцыйная бяспека»**, кваліфікацыя – *«Інжынер»*.

**«Медыцынская фізіка»**, кваліфікацыя – *«Медыцынскі фізік»*.





***Яўген Емяльяненка,** выпускнік 2015 г. спецыяльнасці ядзерная і радыяцыйная бяспека, медыцынскі фізік ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава».*

*– Мне пашчасціла працаваць на дыягнастычным абсталяванні, якое з'яўляецца ўнікальным у Рэспубліцы Беларусь. Гэта пазітронна-эмісійны тамографы, інтэграваныя з камп'ютарнымі тамографамі. На цяперашні момант у краіне ўсяго тры такія ўстаноўкі. Наша абсталяванне дазваляе праводзіць высокадакладныя даследаванні для стадыявання і скрынінгу анкалагічных захворванняў, а таксама для дыягностыкі кардыялагічных і неўралагічных захворванняў (напрыклад, хваробы Альцгеймера).*

**ФАКУЛЬТЭТ ЭКАЛАГІЧНАЙ МЕДЫЦЫНЫ**

**Дэкан – кандыдат сельскагаспадарчых навук дацэнт Ігар Эдуардавіч БУЧАНКОЎ**

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23. Тэл. 398-93-59

Факультэт рыхтуе спецыялістаў, у асноўныя задачы якіх уваходзіць усебаковае вывучэнне і ацэнка фактараў бія- і абіягеннага паходжання на стан розных сістэм арганізма. Спецыялісты атрымліваюць веды ў галіне біяхімічнай, малекулярна-генетычнай, імуналагічнай, цыталагічнай дыягностыкі розных захворванняў; ацэнкі эфектыўнасці правядзення лячэння сучаснымі клініка-лабараторнымі метадамі; распрацоўкі спосабаў карэкцыі розных паталагічных працэсаў, выкліканых тэхнагеннымі нагрузкамі; выяўлення малекулярных маркераў экалагічных уздзеянняў на біялагічныя сістэмы рознага ўзроўню арганізацыі.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па наступных спецыяльнасцях:

**«Медыка-біялагічная справа»**, кваліфікацыя – *«Біёлаг-аналітык. Выкладчык біялогіі»*.

Спецыялізацыі – «Цыталогія», «Біяхімія», «Імуналогія».

**«Медыцынская экалогія»**, кваліфікацыя – *«Эколаг-эксперт»*.

Спецыялізацыі – «Эпідэміялогія», «Радыебіялогія», «Імуналогія».



***Павел Марозік,** кандыдат біялагічных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі».*

*– Я лічу, што вучыўся ў адной з самых унікальных ВНУ ў Рэспубліцы Беларусь, ля вытокаў стварэння якой сталі найбуйнейшыя навукоўцы не толькі Беларусі, але і ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі. Тут працуюць найлепшыя выкладчыкі, вельмі добра арганізавана студэнцкая практыка, якая праходзіць у найлепшых навукова-даследчых установах краіны. Менавіта на практыцы я пазнаёміўся з навуковым кіраўніком маёй дыпломнай працы і магістарскай дысертацыі.*

# ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ

*Дырэктар – кандыдат юрыдычных навук Алег Міхайлавіч СТАРАВОЙТАЎ*
*Адрас: г. Мінск, вул. Камсамольская, 21. Тэл./факс 289-12-82.*
*E-mail: college@bsu.by; www.lawcollege.bsu.by*

**РАЗВІЦЦЁ**

Юрыдычны каледж БДУ адкрыты 1 верасня 2000 г.

Высокі ўзровень падрыхтоўкі ў Юрыдычным каледжы пацвярджаецца тым, што ў цяперашні час больш за 85 % нашых былых навучэнцаў працягваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ, з іх каля 25 % – на дзённых аддзяленнях.

Дзякуючы якаснаму прафесарска-выкладчыцкаму складу (звыш 20 чалавек маюць навуковыя званні і ступені), за 16 гадоў дзейнасці каледж стаў адной з найбольш прэстыжных устаноў краіны, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ**

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па спецыяльнасці «**Правазнаўства**» з наступнымі спецыялізацыямі: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа». Выпускнікам даецца кваліфікацыя *«Юрыст»*.

**НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС**

Навучанне ў каледжы ажыццяўляецца па вучэбных планах і праграмах, якія даюць паглыбленую гуманітарную і спецыяльную падрыхтоўку, а таксама адпаведныя практычныя навыкі.

Навучальны працэс забяспечваюць чатыры кафедры: дзяржаўна-прававых і крымінальна-прававых дысцыплін, агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін, сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, прыродазнаўчых дысцыплін. Дзейнічаюць тры аддзяленні: на аснове агульнай базавай адукацыі і агульнай сярэдняй адукацыі, завочнае аддзяленне.

У каледжы функцыянуюць тры камп'ютарныя класы, а таксама лабараторыя заканадаўства, бібліятэка і чытальная зала з вялікім выбарам найноўшай юрыдычнай літаратуры. Каледж падключаны да агульнаўніверсітэцкай інфармацыйнай сеткі, мае свабодны выхад у інтэрнэт.

Выпускнікі каледжа маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ са скарочаным тэрмінам навучання.

**ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ**

Выпускнікі Юрыдычнага каледжа могуць працаваць:



– у юрыдычных (праваых), кадравых, рэферэнцкіх службах органаў выканаўчай улады (міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржкіравання) і органаў мясцовага кіравання і самакіравання (сацыяльнай абароны, ліцэнзавання і рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, землеўпарадкавання, статыстыкі і інш.);

– юрыдычных (праваых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, некамерцыйных юрыдычных асобаў (грамадскія арганізацыі, прафесійныя саюзы і г. д.);

– органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, выкананне судовых пастаноў, забеспячэнне судовай вытворчасці і г. д.);

– органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і г. д.);

– установах юстыцыі (органы ЗАГСа, натарыяту, адвакатуры, архівы юрыдычных кансультацый).

Наш каледж – навучальная ўстанова для здольных і энергічных юнакоў і дзяўчат. Ён рыхтуе кваліфікаваных юрыстаў, якія спалучаюць глыбокія тэарэтычныя веды з уменнем іх практычнага ўвасаблення. Гэта дазваляе ім знайсці перспектыўную, цікавую, высокааплатную працу, якая будзе для іх справай усяго жыцця.

***ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРЫЁМЕ Ў 2017 г.***

**ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай базавай адукацыі (9 кл.): «Правазнаўства» (спецыялізацыі: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа»). Тэрмін навучання – 2 гады 10 месяцаў. Залічэнне ажыццяўляецца па конкурсе сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі.

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): "Правазнаўства" (спецыялізацыі: "Дзяржаўна-прававая дзейнасць", "Судова-прававая дзейнасць", "Гаспадарча-прававая і кадравая работа"). Тэрмін навучання – 1 год 10 месяцаў. Залічэнне ажыццяўляецца па суме балаў сертыфікатаў ЦТ (беларуская (руская) мова, грамадазнаўства) і сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

**ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

(на бюджэтнай і платнай аснове)

Спецыяльнасць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі (11 кл.): «Правазнаўства» (спецыялізацыі: «Дзяржаўна-прававая дзейнасць», «Судова-прававая дзейнасць», «Гаспадарча-прававая і кадравая работа»). Тэрмін навучання – 2 гады 9 месяцаў.

На завочную бюджэтную форму могуць паступаць асобы, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і працуюць па адпаведнай спецыяльнасці, а таксама дзеці-інваліды, інваліды I, II групы. Залічэнне ажыццяўляецца па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

На завочную платную форму залічэнне ажыццяўляецца па суме балаў сертыфікатаў ЦТ (беларуская (руская) мова, грамадазнаўства) і сярэдняга бала дакумента аб агульнай сярэдняй адукацыі.

Парадак прыёму ў каледж рэгулюецца Правіламі прыёму ў ССНУ, зацверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 № 80 (са зменамі і дапаўненнямі).

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

23 снежня 2016 года
Падпісана да друку 21.12.2016 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by